Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Белар

ГОД ВЫДАЧЫ—XV
№ 2 (3906)
СУБОТА, 3 СТУДЗЕНЯ
1931 г.

Цана нумару 5 кап.
Выходзіць
БЕ СЬГЕРАПЬНЯ

Капіталістычны Захад ў агні клясавых баёў

ПАЧАЛАСЯ ЗАБАСТОЎКА ГАРНЯКОЎ РУРА

160 тысяч ангельскіх гарнякоў пакінулі капальні

БЭРЛІН, 2. Як паведамляюць з Эссена, СЕНЬНЯ Ў РУРСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ ПАЧАЛАСЯ ЗАБАСТОЎКА ГОРНАРАБОЧЫХ. Гарнякі забаставалі пасьля таго, як прадпрыемцы адхілілі патрабаваньні, высунутыя ўчора пашыраным пасяджэньнем цэнтральнага камітэту барацьбы рэвалюцыйнай прафапазыцыі Рурскай вобласьці. Гэтыя ультыматыўныя патрабаваньні прад'яўлены прадпрыемцам сёньня раніцою праз створаныя ва ўсіх капальнях камітэты барацьбы і зводзяцца да наступнага:

1. ПРАДПРЫЕМЦЫ НЕАДКЛАДНА БЯРУЦЬ НАЗАД ЗРОБЛЕНЫЯ ІМІ ПАПРЭДЖАНЬНІ АБ ЗВАЛЬНЕНЬНІ.
2. ЗАРПЛАТА НЯ ЗНІЖАЕЦЦА І ЎМОВЫ РАБОТЫ НЕ ПАГАРШАЮЦЦА.
3. УВОДЗІЦЦА 7-мі ГАДЗІННЫ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ ПРЫ ЗАХАВАНЬНІ СТАРОЙ ЗАРПЛАТЫ.
4. БЕСПРАЦОЎНЫМ ГАРНЯКОМ ПРАДАСТАЎЛЯЕЦЦА РАБОТА.

Сёньня-ж ва ўсіх капальнях распаўсюджана вдозва цэнтральнага камітэту барацьбы, яні заклікае ўсіх рабочых, арганізаваных і неарганізаваных, сацыял-дэмакратаў, каталікоў і камуністаў згуртавана выступіць за гэтыя патрабаваньні рэвалюцыйнай прафапазыцыі і ў выпадку адхіленьня іх прадпрыемцамі неадкладна пачаць забастоўку.

У выпушчанай сёньня пятучцы цэнтральнага камітэту барацьбы рурскіх гарнякоў, яні рэарганізаваны ў цэнтральны забастовачны камітэт, паведамляе аб тым, што РАБОЧЫЯ 31 КАПАЛЬНІ СЁНЬНЯ РАНІЦОЮ СПЫНІЛІ РАБОТУ. Сярод капальень, на якіх пачалася забастоўка, ЗНАХОДЗІЦЦА РАД БУЙНЫХ КАПАЛЕНЬ РУРСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ. Цэнтральны забастовачны камітэт паведамляе, што 3 КОЖНАЙ ГАДЗІНАЙ ДА ЗАБАСТОЎКІ ДАЛУЧАЮЦЦА ЎСЁ НОВЫЯ І НОВЫЯ КАПАЛЬНІ. Лятучка заклікае рабочых сёньняшняй вячэрняй і заўтрашняй раніцкай зьмен неадкладна абраць камітэты барацьбы там, дзе іх яшчэ няма, і далучыцца да забастоўкі.

Лятучка адзначае, што адначасова з пачаткам забастоўкі рурскіх гарнякоў, у АНГЛІІ ПАЧАЛАСЯ ЗАБАСТОЎКА 160 ТЫС. ГАРНЯКОЎ ПАУДНЁВАГА УЭЛЬСА І ШТО Ў БЛІЖЭЙШЫ ЧАС МЭТАЛІСТЫ РЭЙНСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ ТАКСАМА ПАЧНУЦЬ БАРАЦЬБУ СУПРОЦЬ НАСТУПЛЕНЬНЯ ПРАДПРЫЕМЦАЎ. Адзначаючы, што ўвага ўсяго сусьветнага пралетарыяту зьвернута на змаганьне рурскіх гарнякоў, цэнтральны забастовачны камітэт дае лёзунг: «спыніць работу ва ўсіх капальнях Рурскай вобласьці», «Прэч рэфармісцкіх прафбюракратаў, якія падтрымліваюць грабежніцкае зьніжэньне зарплаты», «Прэч урад Брунінга, які прадпісвае гэты грабеж», «прэч сацыял-дэмакратычных, каталіцкіх і фашысцкіх лідэраў, якія кіруюць штрэйбрэхерствам».

«Няхай жыве забастоўка ўсіх гарнякоў Рурскай вобласьці, усіх сацыял-дэмакратычных, беспартыйных і рэвалюцыйных вуглякопаў, якія аб'ядналіся ў адзіным фронце!»

Далей цэнтральны забастовачны камітэт указвае, што ў некаторых капальнях сацыял фашысцкія і фашысцкія прафбюракраты ўжо арганізуюць штрэйбрэхерства. Так, у капальні «Вэстфаль» працуюць далей рабочыя, якія зьяўляюцца членамі каталіцкіх прафсаюзаў і фашысцкіх арганізацый, ня гледзячы на тое, што пераважная большасьць рабочых гэтай капальні баставала. У капальні «БІСМАРК», дзе таксама баставе большасьць рабочых, особныя групы членаў рэфармісцкага прафсаюзу штрэйбрэхерствуе па закліку сацыял-фашысцкіх прафбюракратаў.

(ТАСС).

Да „тыдню Савецкай Беларусі" ў Маскве

Пры непасрэднай дапамозе пралетарыяту Савецкага Саюзу рабочая кляса і працоўныя БССР, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, дасягнулі вялізарных посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве, на базе якога адбываецца нябачаны росквіт пралетарскае культуры. Гэтыя посьпехі гавораць за тое, што мы ідзем шпаркімі тэмпамі па шляху ліквідацыі фантычнай знанамічнай няроўнасьці, якая была намі атрымана ў спадчыну ад мінулага. Тав. Сталін на 16 зьезьдзе УсеКП(б) сказаў: «Сутнасьць нацыянальнага пытаньня РСФСР заключаецца ў тым, каб зьнішчыць тую адстапасьць (гаспадарчую, палітычную і культурную) нацыянальнасьцей, якую яны атрымалі ў спадчыну ад мінулага, каб даць адсталым народам магчымасьць дагнаць цэнтральную Расію ў дзяржаўных, культурных і гаспадарчых адносінах».

Тыя вялізарныя посьпехі ў сацыялістычным будаўніцтве, якія ёсьць у Савецкай Беларусі, гавораць за тое, што мы ідзем шпаркімі тэмпамі па шляху вжыцьцяўленьня гэтай задачы. Асноўныя паказальнікі разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР гэта падцьвярджаюць. Наша сацыялістычная прамысловасьць па валавой прадукцыі больш, як у 3 разы, перавысіла даваенны узровень. Капітальнае будаўніцтва прамысловасьці ідзе шпаркімі тэмпамі. Даводы ўказаць на тое, што мы на капітальнае будаўніцтва выдаткавалі за 1929-30 г. каля 50 млн. руб. Рост рабочай сілы ў прамысловасьці ідзе наступнымі тэмпамі. Калі да вайны на тэрыторыі Беларусі, як рабочых, апрача транспарту, складаў 23 тысячы чалавек, дык у сучасны момант толькі па прамысловасьці ВСНГБ кольмасьць рабочых складае каля 60 тыс. чал. На 1931 год мы мярнуем павялічыць кольмасьць рабочых у прамысловасьці да 93 тысяч чал. Рост вытворчасьці электраэнэргіі таксама ідзе шпаркімі тэмпамі. Калі ў 1914 годзе на тэрыторыі Беларусі вырабляпася 5 млн. клв.-гадзін электраэнэргіі, дык у 1930 годзе і паводле перспэктыўнага пляну на 1931 год мы будзем мець 160,2 млн. клв.-гадзін электраэнэргіі.

На базе магутнага росту прамысловасьці, у нябачаных разьмерах адбываецца сацыялістычная рэканструкцыя сельскае гаспадаркі. Калгасамі ахоплена каля 15 проц. бядняцка - батрацкіх і серадняцкіх гаспадарак. Адну трэць таварнага збожжа ў гэтым годзе мы атрымаем ад саўгасаў і калгасаў. Пасеўную плошчу мы значна павялічылі. Яна зараз складае 3.027,1 тыс. гэкт. Рост машынізацыі сельскае гаспадарчі ідзе наступным чынам. Калі ў 1924 годзе на 1 гэктар пасеўнае плошчы прыпадала машын на 5 руб. 60 кап., дык у 1930 годзе гэта лічба значна павялічылася; яна складае 10 руб. 30 кап. На сёньняшні дзень мы ўжо маем 6 машынна - трактарных станцый, якія абслугоўваюць саўгасы і калгасы, а таксама дапамагаюць бядняцка - серадняцкім гаспадаркам, якія яшчэ не аб'ядналі ў калгасы. Партыя правяла і праводзіць вялізарную работу па выкарчоўваньні рэштак кулацкай палітыкі Прышчэпава, які браў стаўку на хутарызацыю БССР, на разьвіцьцё кулацкай гаспадаркі.

На базе магутнага росту сацыялістычнае гаспадаркі мы маем росквіт пралетарскае культуры. За гэтыя гады мы арганізавалі 12 вышэйшых навучальных устаноў, 65 індустрыяльных тэхнікумаў, тысячы новых школ, клюбаў, хат - чытальняў і г. д. У краіне, якая ня мела ні адной вышэйшай навучальнай установы, зараз ідзе працэс бязупыннага росту культурнага ўзроўню шырокіх працоўных мас. Краіна, якая ў мінулым мела звыш 60 проц. нясьменных, зараз увяла ўсеагульнае абавязковае навучаньне і зьменшыла кольмасьць нясьменных да 16 проц. Ахоп дзяцей школамі ў 192[illegible] складае 86.4 проц. На 1931 го[illegible] на поўнасьцю ахапіць усіх д[illegible]лай. Пастаўлена задача поўн[illegible] відаець нясьменнасьць у [illegible]. Сацыяльны склад студэнцт[illegible] на паляпшаецца. У 1926-27 [illegible]цант рабочых і іх дзяцей у[illegible]даў 14,6 проц., у 1929-30 [illegible] 41,8 проц.

Мы маем 4 дзяржаўні[illegible] дзяржаўнае кіно і г. д. [illegible]дзень мы выдаем па БССР [illegible]сяй. Шпаркімі тэмпамі ра[illegible] газэт, які зараз складае 68[illegible] год. За апошнія часы разв[illegible] і фабрычна - заводзкіх шк[illegible] калгасных газэт.

Расьце і мацнее фронт [illegible] літаратуры.

Мы разгарнулі вялікую [illegible]слугоўваньні працоўных [illegible]цый. Сотні клюбаў, хат-[illegible] і г. д. зьяўляюцца моцн[illegible]мі ў галіне прыцягненьн[illegible] працоўных нацменшасьц[illegible]ніцтва сацыялізму. Пр[illegible]ная работа па інтэрнац[illegible]хаваньні працоўных у[illegible]насьцей, што насяляюц[illegible]

З году ў год паляп[illegible]яльнае становішча ра[illegible] асноўных мас сялян.

Аднак, было-б няпр[illegible] што мы ўжо зусім лік[illegible]тычную няроўнасьць, [illegible] у нас у параўнаньні з трэба[illegible] публікамі Савецкага [illegible]ераходзьваць гэтых [illegible] яшчэ не абярнуліся [illegible] комінаў, але пры зн[illegible]маньні і дапамозе Са[illegible] ідзем даволі шпаркім [illegible]ху індустрыялізацыі [illegible]тва. ГЕЯ на XIII па[illegible]

Пяцігадовы плян [illegible]стрыялізацыі, так і [illegible]тычнай рэканструкц[illegible] даркі і па культ[illegible] зьяўляецца рашаюч[illegible]е канчатковага зн[illegible]най эканамічнай [illegible]насьці нацыяналь[illegible] дзіліся пад уціск[illegible]

Было-б глыбок[illegible]кай думаць, што [illegible] сягненьні, якія [illegible] «мірна». Мы буд[illegible]вінах абвострана[illegible]ня; мы вядзем [illegible] барацьбу з клі[illegible] спробамі перашк[illegible] можнаму сацыя[illegible]ню. Партыя вя[illegible]ганьне з агент[illegible] з апартуністам[illegible] посьпехі дасяг[illegible] доўнаму ажыц[illegible] лініі нашай [illegible] мірымай бар[illegible] ўхілу, які зь[illegible] бясьпекай, су[illegible]му, супроць [illegible] тыпу Ламін[illegible] і інш. Акцы[illegible] палітыкі пар[illegible] мірымай бар[illegible] шавінізмам [illegible] даным этап[illegible] шызму саю[illegible] рускімі нац[illegible] вінізмам і ш[illegible]

• У задачы [illegible] ўваходзіць [illegible] вецкага С[illegible] цыялістыч[illegible] як, взяко[illegible] выражэньн[illegible] цыялістыч[illegible] паказаць, [illegible] ным саюз[illegible] яту Саве[illegible] камуністы[illegible] рамагае [illegible] нас ёсь[illegible]

«Тыдзень Савецкай Беларусі» павінен паказаць, што толькі пралетарыят, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, у саюзе з асноўнымі масамі сялянства можа ажыцьцяўляць асноўны лёзунг партыі — права нацый на самавызначэньне.

Зусім іншае мы наглядаем у Зах. Беларусі, якая знаходзіцца пад ботам польскага фашызму. Глыбокі эканамічны крызіс, які перажывае фашысцкая Польшча, цалкам і поўнасьцю ўскладаецца на плечы працоўных. Поўнае эканамічнае і палітычнае бяспраўе, заняпад гаспадаркі, ваенна - фэадальная эксплёатацыя шырокіх мас працоўнага сялянства, поўны ўпадак нацыянальнай культуры, гвалтоўная палёнізацыя, прасьледваньне беларускай школы, кнігі, прасьледваньні рэвалюцыйнага руху — вось, што характэрна для Зах. Беларусі, якая задыхаецца пад уціскам польскага фашызму.

Працэс «прампартыі», выкрытая ДПУ Беларусі контр - рэвалюцыйная інтэлігенцкая група нацыянал - дэмакратаў наглядна паказвоць, як зьнешнія і ўнутраныя ворагі Савецкага Саюзу зноў рыхтуюць крывавую пазьню для рабочых і працоўнага сялянства. Савецкая Беларусь ёсьць фарпост Савецкага Саюзу. Ёй першай прыдзецца вытрымаць рашучыя баі з сусьветным капіталізмам і яго борзым сабакай — фашысцкай Польшчай. Гэта абавязвае нас усімі мерамі ўмацоўваць абароназдольнасьць краіны, узмацняць баявую магутнасьць Чырвонай армії.

Працоўныя БССР добра памятаюць дні нячуванага разгулу белапольскіх банд, банд міністра па вайсковых справах беларускай народнай рады — Бупак-Балаховіча і інш. наймітаў капіталу. Рабочыя і бядняцка - серадняцкія масы сялянства бачаць і цяпер вынікі капіталістычнай «цывілізацыі» у Зах. Беларусі. Таму зусім ня дзіўна, што беларускія контр - рэвалюцыянэры —нацыянал - дэмакраты ня мелі ніякае апоры ў масах працоўных. Працоўныя добра ведаюць, што азначаюць і куды вядуць «размовы» аб незалежнай Беларусі, аб арыентацыі на капіталістычны Захад і г. д. Рабочыя і працоўнае сялянства ведаюць, што гэта ёсьць толькі шыльда, пад якой хаваецца ярмо, яксе хочуць зноў адзець на шыю працоўных праз нацыянал - дэмакратаў і іх агентаў — нацыянал - апартуністаў.

«Тыдзень Савецкай Беларусі» лішні раз падкрэсьлівае вялізарную кроўную брацкую сувязь працоўных нацыянальнасьцей усяго Савецкага Саюзу.

Сярод шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў, батрацка - бядняцкіх і серадняцкіх колаў сялянства правядзеньне «тыдню Савецкай Беларусі» ў Маскве выклікала новую хвалю творчага энтузіязму. «Тыдзень» — лепшы довад вялізарнай пралетарскай салідарнасьці працоўных БССР з працоўнымі масамі ўсяго Савецкага Саюзу. Сёньня мы падаем рад рапартоў з фабрык, заводаў, саўгасаў, калгасаў. Яны гавораць аб тым, што вялізарныя задачы па сацыялістычным будаўніцтве ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі, якія стаяць перад працоўнымі, будуць выкананы.

Партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі павінны павесьці шырокую растлумачальную работу сярод шырокіх мас працоўных аб задачах і мэтах гэтага «тыдню».

Пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі і ае ленінскага ЦК, змагаючыся з усякімі апартуністычнымі скажэньнямі ленінскай лініі нашай партыі, Савецкая Беларусь і надалей будзе моцнай апорай сацыялістычнай бацькаўшчыны —СССР і ў брацкім саюзе з працоўнымі ўсіх нацыянальнасьцей Савецкага Саюзу будзе ісьці шпаркімі крокамі да канчатковае перамогі сацыялізму.

Гаспадарчы развал у Польшчы павялічваецца

Польская буржуазія ў трывозе

Дэманстрацыі беспрацоўных у Лодзі

Беспрацоўе ў фашысцкай Польшчы катастрафічна павялічваецца. Перад калядамі сталі амаль усе фабрыкі Лодзі, дзесяткі тысяч рабочых выкінуты на вуліцу. Кожны дзень спыняюць працу ўсё новыя і новыя фабрыкі і заводы, новыя тысячы рабочых застаюцца бяз працы. Павялічваецца армія галодных, беспрацоўных рабочых.

Усё больш часта беспрацоўныя выходзяць на вуліцу з пратестам. Гэтымі днямі, як падае орган сацыял-фашыстаў «Работнік», у Лодзі адбылася значная дэманстрацыя беспрацоўных, якія накіраваліся да магістрату. Дэманстрантамі вывешаны былі на электрычных правадох чырвоныя сьцягі. Падасьнеўшы ды ўрадам паліцыі дэманстрацыя была разагнана, некальні чалавек арыштавана.

Масавыя арышты ў Варшаве

«Кур'ер Віленскі» паведамляе, што 30 сьнежня вечарам паліцыя арыштавала 46 чал. — удзельнікаў сходу ў памяшканьні згульчага працэсу прафсаюзу хімікаў. У часе абыску ў іх знойдзена шмат матар'ялаў, якія сьведчаць аб камуністычнай дзейнасьці членаў гэтага саюзу. Памяшканьне прафсаюзу апячатана.

НЯ МАЮЦЬ НІЯКІХ НАДЗЕЙ НА ПАЛЯПШЭНЬНЕ СТАНОВІШЧА

ВАРШАВА, 2. Уся польская прэса, ня выключаючы газэт прысудчыкаў, прымушана ў сваіх новагодніх артыкулах прызнаць, што мінулы год быў годам глыбокага эканамічнага крызісу і вялізарных гаспадарчых труднасьцяй. Пры гэтым ня чыкаваюць ніякіх надзей на паляпшэньне становішча ў бліжэйшы час. Адна толькі «Газэта Польска» з уласьцівым ёй казённым аптымізмам спадзяецца, што «звычайна часьля крызісу начынаецца гаспадарчы ўздым». Права-апазыцыйная прэса, аналізуючы палітычнае становішча Польшчы, прыходзіць да высноў што на міжнароднай арэне Польшча за мінулы год пацярпела рад сур'ёзных страт і што новы год Польшча сустракае ва ўмовах абастрэньня польска-нямецкіх адносін.

Пераходзячы да ацэнкі ўнутранага становішча, апазыцыйная прэса заяўляе, што ўнутранае становішча змагальне барацьбы перанесена з вузкага участку фронту ў сойме на вельмі шырокі фронт, які ахапляе ўсю краіну. Антаганізм паміж кіруючымі крайнай прысудчыкамі і масамі насельніцтва надзвычайна абвострыўся і права-апазыцыйная прэса з вялікай трывогаю глядзіць на бліжэйшае будучае. (ТАСС).

129 ПРАТЭСТАЎ СУПРОЦЬ ВЫБАРАЎ У СОЙМ

«Дзеньнік Віленскі» у адным з сваіх апошніх нумароў падае, што ў вярхоўны суд паступіла 129 пратестаў супроць розных злачынстваў, дапушчаных адміністрацыяй у часе выбараў у апошні сойм. Для разгляду гэтых пратестаў вызначана 24 судьдзі.

Настрой ангельскіх гарнякоў бадзёры

ЛЁНДАН, 1. 160 тыс. гарнякоў паўднёвага Уэльсу пачалі забастоўку. Пад націскам рабочых мас рэфармісцкія прафбюракраты, якія заклікалі раней крывадушна да забастоўкі ў замяшаньні шукаюць зараз шляхоў да адступленьня і заяўляюць аб сваёй поўнай гатоўнасьці адпавіць перагаворы з прадпрыемцамі. Сустрэча паміж прадстаўнікамі прадпрыемцаў і прафбюракратамі чакаецца ў суботу 3 студзеня. Кіраўнікі руху меншасьці тым ня менш заклікаюць гарнякоў ад імя забастовачных камітэтаў, не захапляючыся якой-бы там ні было згодай паміж прадпрыемцамі і прафбюракратамі, ня спыняць барацьбу. Рух меншасьці склікае спэцыяльную канфэрэнцыю гарнякоў паўднёвага Уэльсу 11 студзеня, запрашаючы на яе таксама дэлегатаў з вугольнага раёну Потэр. Рэвалюцыйны рух меншасьці прапануе ўсім прафсаюзам абмеркаваць пытаньне аб падтрыманьні гарнякоў паўднёвага Уэльсу. Склікаюцца сходы капальных упаўнаважаных і шырокія канфэрэнцыі радавых гарнякоў. Рух меншасьці падкрэсьлівае, што ўсе намаганьні павінны быць накіраваны на ўмацаваньне кампаніі за рабочую партыю. Шатландзкі саюз гарнякоў у асобнай адозве да гарнякоў паўднёвага Уэльсу заклікае аб сваёй поўнай з імі салідарнасьці.

Рэфармісты ўсімі сіламі стараюцца сарваць забастоўку

ЛЁНДАН, 1. Забастоўка 160 тысяч гарнякоў у паўднёвым Уэльсе прапікавецца. Настрой бастуючых бадзёры. Трэд'юніёністкія бюракраты напружваюць усе сілы, каб сарваць забастоўку. Яны зьвярнуліся да прадпрыемцаў з просьбай безадкладна арганізаваць супольную нараду для абмеркаваньня пытаньняў і спыненьня забастоўкі. Прадпрыемцы адпак адхілілі хадайніцтва, зазначыўшы, што яны ня могуць весьці нараду з трэд'юніёністкімі бюракратамі раней 3 студзеня, калі пачнецца трацейскі разгляд канфлікту. Сакратар рэфармісцкай фэдэрацыі гарнякоў Артур Кук некалькі галзін быў у міністэрстве па справах каменна-вугальнай прамысловасьці, настойліва дамагаючыся ўмяшальнасьці ўлады з мэтаю спыніць забастоўку. Трэд'юніёністкія бюракраты сёньня выступілі з прамовамі, у якіх поўнасьцю выкрылі сваю паражэнцкую пазыцыю і прабавалі да мінімуму зглаадзіць разгалоўсці паміж прадпрыемцамі і гарнякамі. Прафбюракраты заклікалі спыніць забастоўку, зазначаючы, што яна наносіць вялікія страты каменна-вугальнай прамысловасьці.

(ТАСС).

Як будзе праходзіць „тыдзень Савецкай Беларусі"

МАСКВА, 2. Камакадэміяй арганізаваны камітэт на чале з тав. Чэржанцавым па правядзеньні «тыдню» Савецкай Беларусі».

Адказны сакратар КОПП у гутарцы з супрацоўнікам ТАСС сказаў: камітэт, арганізоўваючы «тыдзень», ставіць перад сабой задачу выявіць асноўныя рысы нацыянальнай палітыкі савецкай улады, пралетарскай культуры Беларусі на прыкладах клясавай барацьбы рабочых і сялян БССР, іх актыўнага ўдзелу ў будаўніцтве сацыялізму. «Тыдзень» таксама чае на мэце выявіць антыімпэрыялістычную сушнасьць савецкай улады, глыбокі інтэрнацыяналізм рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас СССР і БССР, а таксама ступень абароназдольнасьці Савецкай Беларусі ў барацьбе з надыходзячай ваеннай небясьпекай.

Арганкамітэт распрацаваў шырокі плян па правядзеньні «тыдню». 3-га студзеня арганізуецца ўрачыстая сустрэча беларускай дэлегацыі на вакзале, дзе да дняе адбудзецца мітынг з удзелам пралетарыяту маскоўскага пралетарыяту, партыйных, прафесыянальных і навуковых арганізацый. На прадмету «тыдню» у МХАТЕ і Беларускі Дзяржаўны Тэатр дасьць рад спэктакляў для рабочых Масквы.

У рабочых клюбах адбудуцца вечары замычкі беларускіх таварышоў з маскоўскім пралетарыятам. Аркамітэт таксама арганізуе ў навуковых установах Масквы рад дакладаў дэлегатаў Савецкай Беларусі, навуковых супрацоўнікаў камакадэміі аб дасягненьнях Беларусі.

Дэлегаты Беларусі прымуць удзел у рабоце сесіі ЦВК. У калённым залі Саюзаў адбудзецца вечар замычкі ўдарнікаў Савецкай Беларусі з ударнікамі Масквы, на якім выступяць з паведамленьнямі аб результатах сацыялістычнага ўдарніцтва ў БССР. ВОКС будзе інфармаваць шырокія колы пралетарскай грамадзкасьці заграніцай шляхам трансляцыі па радыё на чужаземных мовах аб ходзе «тыдню». ВОКС выпусьціць таксама спэцыяльнае выданьне на чужаземных мовах, прысьвечанае «тыдню».

Вечар сустрэчы беларускіх і маскоўскіх журналістаў адбудзецца ў доме друку.

У апошні дзень «тыдню» аркамітэт арганізуе ў Вялікім тэатры ўрачыстае пасяджэньне з пралетарыятам ураду, партыйных, прафесыянальных арганізацый і маскоўскіх прадпрыемстваў.

ДРОВ[illegible] МЕНСКУ

СТО ВАГОНА[illegible] СУТКІ, НЯ МЕНШ

ЧЫГУНАЧНЫЯ АРГАНІ[illegible] ТАРМОЗЯЦЬ АДГРУЗКУ ДРОУ

НЕАДКЛАДНА ПЕРАЬ[illegible] РАБОТУ ДРЫВЯНОГА СКЛАДУ

Не аслабляць адгрузкі

Дзякуючы прынятым рашучым мерам за апошнія дні адгрузка дроў для Менску павялічылася. 1-га студзеня атрымана 126 вагонаў, 2-га студзеня — 102 вагоны.

Большасьць раённых партыйных арганізацый усьвядомілі сабе важнасьць кампаніі, у выніку чаго гэтыя раёны значна перавыканалі даныя ім заданьні.

Асаблівай увагі заслугоўвае прыклад барковіцкіх калгасьнікаў, якія адгрузілі для Менску каля 200 вагонаў дроў. Але побач з гэтым асобныя партыйныя арганізацыі (Рагачоў, Глуск, Хойнікі) бязьдзейнічаюць, адгрузка дроў праходзіць марудна, альбо зусім не пачыналася.

У радзе раёнаў адгрузка тармозіцца адсутнасьцю вагонаў, напрыклад, на ст. Ельск накапілася 275 вагонаў дроў, якія не адгружаюцца выключна з-за адсутнасьцю вагонаў. Чыгуначная адміністрацыя на ўлічыла важнасьць забесьпячэньня Менску дрывамі і ня прымае ніякіх мер, каб паскорыць адгрузку.

Яшчэ горш справа стаіць з выдачай дроў на складзе МДРК. Работа складу да гэтага часу ня перабудавана. На складзе нараспашчаму вялікія чэргі. Рабочаму для атрыманьня шуткі дроў трэба патрапіць цэлы дзень. Бываюць выпадкі, калі ў выдачаны час ён ня можа атрымаць дроў.

Партыйныя арганізацыі вылучаных раёнаў для адгрузкі дроў для Менску павінны не аслабляць работы на адгрузцы, ужыўшы рашучыя меры да тых, хто тармозіць своячасовую адгрузку дроў для Менску.

Лесапрамгас бязьдзейнічае

ПАСТАЛЫ. (Па тэлегр.). Замест грузкі штодзённа 18 вагонаў дроў—2[illegible] сьнежня адгружана 8 вагонаў, 27-га [illegible] вагоны, 28-га—3 вагоны, 29 і 30-га [illegible] грузка зусім ня праводзілася.

Дырэктар лесапрамгасу Рэйдар [illegible] дзейнічае і ня прымае ніякіх мер [illegible] ўмацаваньня адгрузкі дроў для Менск[illegible]

Каяя дапамога

БО[illegible] (ПА ТЭЛЕГР.) НА АГУ[illegible]ОДАХ КАЛГАСЬНІКАЎ БОР[illegible] РАЁНУ ПАСЬЛЯ ІНФАР[illegible] НЕАБХОДНАСЬЦІ ЎЗМА[illegible]АДГРУЗКІ ДРОЎ ДЛЯ МЕ[illegible]ГАСЬНІКІ АБВЯСЬЦІЛІ СЯ[illegible]ЗАВАНЫМІ.

[illegible]СЬНЕЖНЯ БЫЛІ АРГАНІ[illegible]ЗАТОРНІКІ. ЗА ГЭТЫЯ ТРЫ [illegible]ДНІ КАМГАСЬНІКІ АДГРУЖАНА ДЛЯ МЕНСКУ КАЛЯ 200 ВАГОНАЎ. АД ГРЭЦЯГВАЕЦЦА.

Н. Ельск накапі[illegible] 275 вагонаў дроў

(Па тэлегр.). На станцыі [illegible]апілася 275 вагонаў дроў. [illegible]х для Менску. За 27 і 28 [illegible]адружана ўсяго 6 вагонаў. [illegible]нежня па 2-га студзеня ад[illegible] 12 вагонаў. Адгрузка тармо[illegible]тнасьцю вагонаў.

[illegible]чная адміністрацыя адмаў[illegible] прадастаўляць патрэбную [illegible]ць вагонаў і ня прымае ніяк[illegible]да ўмацаваньня падачы вагонаў пагрузку.

[illegible]даньні перавыконваюць

[illegible]НКАВІЧЫ. (Па тэлеф.). Дзякуючы [illegible]е з боку раённых партыйных ар[illegible]ый адгрузка дроў для Менску за [illegible]я дні павялічылася.

[illegible] сьнежня адгружана 8 вагонаў [illegible] — 10 вагонаў, 29-га—15 вагонаў [illegible]-16 вагонаў і 1-га студзеня адгру[illegible] 48 вагонаў.

[illegible]ныя партыйныя арганізацыі і леса[illegible]ас паставілі перад сабой задачу [illegible]ці штодзённую адгрузку ў сярэдзі[illegible] 25 вагонаў замест 12-ці, вызна[illegible] плянам.

Патрабуем тэрміновага ўмяшаньня пракуратуры

У Сьмілавіцкім раёне ў Трасьцянецкім лесазагатоўчым вучастку на аддалёласьці 20-25 кілёмэтраў ад Менску ёсьць каля 8.000 куба-мэтраў дроў.

Замест адпраўкі гэтых дроў на фурманках непасрэдна ў Менск, Трасьцянецкае ляспіцтва адпраўляе іх на ст. Калодзішчы, якая знаходзіцца на аддалёласьці 18 кілёмэтраў ад месца лесазагатовак. На станцыі Калодзішчы дровы ляжаць месяцы тыдні і ня могуць быць адпраўлены ў Менск з-за адсутнасьці вагонаў.

Працаўнікі Трасьцянецкага ляспіцтва ў дадатак да гэтых галавацяпстваў займаюцца самазабесьпячэньнем, адпраўляючы дровы сваім знаёмым служачым Менскага лесапрамгасу. Так, па нараду № 88.902 адпраўлена ў Менск на сялянскія фурманках 100 куб. мэтраў дроў для служачых Менскага лесапрамгасу. Сяляне часта ня могуць знайсьці адрасатаў і прымушаны весьці гэтыя дровы назад.

Вышэй паданыя факты можна кваліфікаваць, як простае шкодніцтва з мэтай сарваць забесьпячэньне Менску дрывамі.

Мы патрабуем безадкладнага ўмяшаньня ў гэтую справу пракуратуры рэспублікі, каб пакажыць кінец шкодніцтву ў Трасьцянецкім лесапрамгасе. Вінаватыя павінны быць зараз-на прыцягнуты да судовай адказнасьці.

Брыгадзір Х.

Бярэце прыклад

ПЕТРЫКАЎ. (ПА ТЭЛЕГР.). РАЁННЫ КАМІТЭТ ПАРТЫІ АБВЯСЬЦІЎ АРГАНІЗАЦЫІ МАБІЛІЗАВАНЫМІ НА ЎМАЦНЕНЬНЕ АДГРУЗКІ ДРОЎ ДЛЯ МЕНСКУ.

ДЗЯКУЮЧЫ ЎВАЗЕ З БОКУ ПАРТЫЙНЫХ І САВЕЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ШТОДЗЕННА АДГРУЖАЕЦЦА ДЛЯ МЕНСКУ КАЛЯ 60 ВАГОНАЎ ДРОЎ.

28-га СЬНЕЖНЯ АДГРУЖАНА 80 ВАГОНАЎ, 29-га — 60 ВАГОНАЎ, 30-га — 60 ВАГ. 1 31-га — 50 ВАГОНАЎ АДГРУЗКА ПРАЦЯГВАЕЦЦА.

Па-бальшавіцку рыхтавацца да другой калгаснай вясны

Веснавая пасеўная кампанія 1931 году мае вялізарнейшае значэньне ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Пасьпяховае вырашэньне задач веснавой сяўбы зьяўляецца магутным сродкам у выкананьні пяцігодкі за 4 гады і павінна праводзіцца пад знакам замацаваньня і далейшага пашырэньня сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі.

Веснавая пасеўная кампанія павінна зьявіцца сапраўды бальшавіцкай калгаснай вясной. Ужо зараз партыйныя арганізацыі павінны разгарнуць работу па арганізацыі больш масавага прыліву ў калгасы бядняцка-серадняцкага сялянства, якое па вопыце пераканалася, што шлях калектывізацыі ёсьць адзіны шлях сапраўды магутнага ўздыму сельскай гаспадаркі.

Асноўнымі задачамі партарганізацый па правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі зьяўляюцца:

1) Далейшае рашучае ўмацненьне сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі, арганізацыя новых саўгасаў і калгасаў, пашырэньне і ўмацненьне існуючых і правільная арганізацыя працы ў савецкіх гаспадарках і калгасах.

2) Значнае пашырэньне таварыхваў па супольнай апрацоўцы зямлі, як першапачатковай формы калгасаў, у мясцох, дзе няма калгасаў, асабліва ў раёнах хутарскога зямлякарыстаньня, бяручы цьвёрдую стаўку на сельска-гаспадарчую артель, як асноўную форму калгаснага руху на даным этапе.

3) Максымальнае ўцягненьне бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у вытворчыя каапэрацыйныя аб'яднаньні праз арганізацыю спэцыялізаваных вытворчых таварыстваў з устаноўкай на тое, каб ахапіць гэтымі аб'яднаньнямі ў асноўным усе бядняцка-серадняцкія гаспадаркі, што не ўвайшлі яшчэ ў калгасы.

4) Максымальнае пашырэньне пасеўных плошчаў пад яравымі культурамі, павялічэньне іх на 17 проц. параўнаньні з 1930 г. шляхам распрацоўкі бросавых зямель, скарыстаньня мэліяраваных плошчаў, ворыва сухаполаў, пяпрыгодных сенажаняй, скарачэньне папарнага кліну. Давесьці ўдзельную вагу сацыялістычнага сэктара ў пасеўных плошчах да 37 проц. супроць 17,4 проц. у мінулым годзе.

5) Падняцьце ўраджайнасьці ў параўнаньні з ураджайнасьцю за апошнія 3 гады па наступных паказальніках: у саўгасах па збожжавых культурах — на 115 проц., па тэхкультурах (лён і каноплі) — на 35 проц., па бульбе — на 30 проц.; у калгасах: па збожжавых культурах — на 55 проц., тэхкультурах і бульбе — 30 проц.; у індывідуальных гаспадарках: па збожжавых культурах — на 25 проц., тэх культурах—на 30 проц. і па бульбе — на 25 проц.

6) Рашучае ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў у галіне спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі, завастрэньні асаблівую ўвагу на разьвіцьці і пашырэньні пасеўных плошчаў пад тэхнічнымі культурамі, аднагадовымі травамі і сіласнымі культурамі, як кармавой базе для разьвіцьця малочнай жывёлагадоўлі і прамысловай сьвінагадоўлі.

Для забесьпячэньня поўнага выкананьня задач веснавой сяўбы ЦК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Шырока разгарнуць і рашуча палепшыць масава-палітычную работу сярод батрацтва і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства для арганізацыі шырокага прыліву ў калгасы. Арганізаваць работу сярод бедн

ПАПАУНЯЦЬ ПАРТЫЮ ЛЕПШЫМІ РАБОЧЫМІ-УДАРНІКАМІ

Рад вытворчых парткалектываў Барысаўскай арганізацыі марынуе заявы рабочых аб уступленьні ў партыю

На аснове пастаноў пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) яшчэ больш мабілізуем партыйныя масы на змаганьне за генэральную лінію партыі

Аб росьце і рэгуляваньні сацыяльнага складу Гомельскай гарпартарганізацыі

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б па дакладу Гомельскага гаркому КП(б)Б

Заслухаўшы даклад тав. Хлеўнікава аб росьце і рэгуляваньні сацыяльнага складу Гомельскай партарганізацыі за 1930 г., сакратарыят ЦК КП(б)Б адзначае ўзмацненьне работы партарганізацыі па ўцягненьні прамысловых рабочых у партыю (за 1929 г. прынята 601, а за 1930 г.—4.134 чал.) і правільную лінію гаркому ў галіне рэгуляваньня сацыяльнага складу прынятых (96,1 проц. рабочых, 0,6 проц. сялян, 3,1 проц. служачых у складзе прынятых за 1930 г.).

Упішаючы, аднак, наяўнасьць вялікай вытворчай базы ў Гомелі і зусім недастатковую партыйную праслойку па радзе асноўных прадпрыемстваў Гомелю (Сельмаш—6,84 проц., швэйная фабрыка «Камінтэрн»—13 проц., абутковая фабрыка «Праца»—12,62 проц. і інш.), сакратарыят ЦК КП(б)Б прызнае тэмп росту партарганізацыі за лік прамысловых рабочых недастатковым.

Сакратарыят асабліва адзначае вялікае ашкаленьне росту партарганізацыі ў другім паўгодзьдзі (за першае паўгодзьдзе прынята 810, у другім—324 ч.), што зьяўляецца вынікам аслабленьня ўвагі партарганізацыі да пытаньняў вярбоўкі ў партыю рабочых у другім паўгодзьдзі.

Асноўнымі недахопамі вярбовачнай работы Гомельскай партарганізацыі зьяўляюцца:

Адсутнасьць пастаяннай і сыстэматычнай работы па вярбоўцы, перавага кампанейскага мэтаду вярбоўкі, наяўнасьць самацёку па радзе парткалектываў і парт'ячэек (Сельмаш, цукорня імя 10-га Кастрычніка, «Вэзувій», ф-ка «Праца» і ф-ка «Камінтэрн»), адставаньне тэмпаў перабудовы партработы на вытворчасьці і наяўненьне ўявязаць работу партарганізацыі на розных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва з задачамі абдару і вярбоўкі ў партыю перадавых рабочых-ударнікаў.

Сакратарыят ЦК КП(б)Б прапануе Гомельскаму гаркому КП(б)Б забясьпечыць рашучы пералом у рабоце ўсёй партарганізацыі па ўцягненьні прамысловых рабочых у партыю, разгарнуўшы штодзённую і сыстэматычную работу ўсёй партарганізацыі па вярбоўцы ў партыю рабочых і работніц.

У мэтах узмацненьня росту партарганізацыі сакратарыят ЦК КП(б)Б Гомельскаму гаркому прапануе:

1. У двухдзекадны тэрмін праверыць работу па вярбоўцы ў партыю, прычыны аслабленьня росту за другое паўгодзьдзе, павесьці рашучую барацьбу па ліквідацыі кампанейскіх мэтадаў вярбоўкі і самацёку па радзе парт'ячэек.

2. Гаркому безадкладна разгарнуць работу па перабудове ўсёй партработы на прадпрыемствах, узяўшы рашучы курс на ўмацаваньне нізавога партыйнага зьвяна (цэх'ячэек, партгруп, партарганізатараў і інш.), дабіцца актыўнай работы ўсіх партарганізацый і камуністаў па вярбоўцы ў партыю перадавых рабочых-ударнікаў.

3. Забясьпечваючы ўзмацненьне ўсёй вярбовачнай работы, гаркому зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўзмацненьне вярбоўкі ў партыю рабочых-ударнікаў Беларусаў, а таксама далейшае ўмацаваньне росту за лік рабочых-камсамольцаў.

4. Адзначаючы адставаньне работы па вярбоўцы прамысловых работніц, гаркому дабіцца ў далейшым узмацненьня вярбоўкі ў партыю работніц, зьвярнуўшы пры гэтым асаблівую ўвагу на прадпрыемствы, якія маюць вялікую колькасьць работніц (запалкавая, швэйная прамысловасьць, ф-ка цукерак і г. д.).

5. Гаркому паставіць пытаньне аб вярбоўцы ў партыю на нарадзе сакратароў ячэек, а таксама паставіць гэта пытаньне на агульных сходах парткалектываў, усебакова абмеркаваўшы прычыны слабога тэмпу росту і канкрэтных задач партарганізацыі па разгортаньні штодзённай і сыстэматычнай вярбовачнай работы.

Арг'інструктарскаму аддзелу праз 3 месяцы праверыць работу Гомельскай партарганізацыі па вярбоўцы ў партыю прамысловых рабочых.

На поўны ход

У рабоце Бульскай раённай партарганізацыі за апошні час вызначаюцца некаторы пералом у справе прыёму ў партыю і ў рабоце па рэгуляваньні сацыяльнага складу арганізацыі. За верасень-сьнежань прыняты ў партыю 31 чал. Рабочая і батрацкая праслойка за гэты пэрыад павялічилася ў складзе раённай арганізацыі на 1,6 проц. Такім чынам, 40,9 проц. раённай партарганізацыі зараз складаюць рабочыя і батракі.

Аднак, рад яшчэ не выкарыстоўнае зрастаючай актыўнасьці рабочых, батракоў і бядняцка-серадняцкіх мас вакол практычнага ажыцьцяўленьня задач партыі на вёсцы і тая шматзначная база для росту за лік рабочых і батракоў, якая ёсьць у раёне. Парт'ячэйка II дарадзіцкай за тры месяцы прыняла ў партыю толькі аднаго рабочага. Мішкаўская ячэйка і ячэйка торфазаводу пытаньнямі росту зусім не займаліся, апартуністычна ігнаруючы цырэкты партыі ў гэтай галіне работы.

Найбольш слаба праходзіць рост раённай партарганізацыі за лік жанчын-работніц, батрачак і калгасьніц.

Райком партыі, падагуліўшы вынікі росту, завастрыў увагу раённай партарганізацыі на задачах паляпшэньня рэгуляваньня сацыяльнага складу партыі.

Першараднай задачай арганізацыі зьяўляецца ўцягненьне ў сетку партасьветы ўсіх прынятых у партыю таварышоў.

Я. І.

Самацёкам

Барысаўскай раённай партарганізацыяй ня выконваецца дырэктыва ЦК КП(б)Б аб росьце і рэгуляваньні сацыяльнага складу партарганізацыі. Замест таго, каб забясьпечыць у складзе тых, што прымаюцца ў партыю, 80 проц. рабочых ад варштату, гэты пропант і напалову ня выконваецца за апошні час.

Чым-жа тлумачыцца, што гэты раён, як прамысловы, мае невычарпальную базу для росту за лік рабочых, а на справе — такое педапучпчальнае адставаньне ў справе вярбоўкі ў партыю рабочых ад варштату, лепшых ударнікаў?

Прычына заключаецца ў тым, што райком партыі не мабілізаваў усю раённую партарганізацыю на выкананьне важнейшых дырэктыў партыі аб рэгуляваньні сацыяльнага складу парт арганізацыі. Райком па каляндарным пляне падагульвае вынікі росту за 3-6 месяцаў, дае ўстаноўкі, а на праверку выкананьня пастаноў не зварачае ніякай увагі. Рост раённай партарганізацыі праходзіць самацёкам. Большасьць ячэек гэтым пытаньнем сыстэматычна не займаецца, не праводзіць у гэтым напрамку адпаведнай работы сярод рабочага актыву. Беспартыйныя рабочыя зусім у пязначнай колькасьці ўцягнуты ў палітвучобу. У асобных выпадках назіраецца штучнае затрымліваньне росту за лік рабочых. Папрыклад, у парткалектывах фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна» і гуты імя Домбаля па 4 месяцы не разглядаюцца заявы рабочых аб прыёме ў партыю. Райком на гэтыя факты не рэагуе. Таксама зусім слаба праходзіць рост раённай партарганізацыі за лік рабочых-камсамольцаў.

Такое становішча нецярпіма. Барысаўская раённая партарганізацыя, уступаючы ў трэці год пяцігодкі, мабілізуючы рабочыя масы на выкананьне пляновых заданьняў гэтага году, павінна забясьпечыць пералом у справе росту за лік перадавых рабочых ад варштату.

Дз. П—к.

Партыйныя масы ухваляюць пастановы пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б)

Агульны сход парткалектыву КУБ імя Леніна заслухаў даклад тав. Гападзеда аб выніках аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б). У аднагалосна прынятай па дакладу рэзалюцыі гаворыцца: сход парткалектыву Камбузу Беларусі імя Леніна цалкам ухваляе пастановы, прынятыя пленумам, якія накіраваны на далейшае рашучае разгортваньне сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, на разгортваньне непрымірымай барацьбы супроць капіталістычных установак правых і «левых» апартуністаў.

Парткалектыў Камбузу ўхваляе кантрольныя лічбы сацыялістычнага будаўніцтва на 1931 г., якія выражаюць цьвёрдае і пасьлядоўнае правядзеньне генэральнай лініі партыі па асноўнае пастаноў XVI зьезду.

Вялізарнейшую ролю ў справе ажыцьцяўленьня лёзунгу «Пяцігодка—за чатыры гады», у выкананьні грандыёзнай праграмы будаўніцтва ў трэцім годзе пяцігодкі павінны адыграць саветы.

Сход падкрэсьлівае, што неабходнай умовай посьпеху ў карэннай перабудове савецкай работы зьяўляецца рашучае выкарыстаньне правапартуністычнай практыкі ў рабоце саветаў і ачышчэньне органаў саветаў ад правых апартуністаў і бяспрынцыпных прымірэнцаў.

Агульна-партыйны сход Камбузу вітае назначэньне т. Молатава на пост старшыні СНК СССР і бачыць у гэтым назначэньні заруку ўзмацненьня і павышэньня ролі саветаў, як правадніковай генэральнай лініі партыі. Адначасова сход ухваляе пастанову аб аслабаненьні т. Рыкава ад абавязкаў члена Палітбюро ЦК УсеКП(б).

Сход цалкам ухваляе пастанову пленуму на пытаньні рабочага забясьпечэньня і катэгарычна патрабуе ад спажывецкай кааперацыі рашучага выкарчоўваньня з практыкі яе работы элементаў апарту́нізму, бюракратызму, бязьлітаснай чысткі апарату ад меншавіцка-эсэраўскіх і апартуністычных элементаў, шырокага вылучэньня і падрыхтоўкі пралетарскіх кааперацыйных кадраў. Сход патрабуе ад прафсаюзаў рашучага ўзмацненьня масавага пралетарскага кантролю над работай кааперацыі і самага актыўнага ўдзелу ў арганізацыі рабочага забясьпячэньня.

Выкананьне грандыёзнае праграмы сацыялістычнага наступленьня патрабуе згуртаваньня ўсіх сіл рабочае клясы на аснове ленінскай лініі вакол ЦК УсеКП(б) і стойкага правядзьбы партыі тав. Сталіна, неаслабнага змаганьня на два фронты і, перш за ўсё, супроць галоўнай на даным этапе праваапартуністычнай небясьпекі, рашучага выкрыцьця капітулянцкае ліпіфоры правасьлянскага» блёку і перамаганьня бяспрынцыпных прымірэнцаў.

Ня гледзячы на заявы лідэраў правай апазыцыі т. т. Бухарына і Рыкава, у якіх яны фармальна прызналі свае памылкі, яны да тэтага часу не прыступілі да рашучай крытыкі тэтых сваіх памылак і на справе не праводзілі сыстэматычнага змаганьня за генэральную лінію партыі. Лічачы недапрымім дасьлешнае адмеўчваньне замест крытыкі сваіх поглядаў, агульны сход патрабуе ад т. т. Бухарына і Рыкава выступіць з крытыкай сваіх поглядаў і памылак і не на словах, а на справе, даказаць сваю згоду з генэральнай лініяй партыі.

Няхай жыве правадыр сацыялістычнага будаўніцтва—УсеКП(б) і яе штаб—ленінскі ЦК на чале з тав. Сталіным!

Б.

МЕНСКІ ГАРСАВЕТ — ПЕРАД СУДОМ ВЫБАРШЧЫКАЎ

ГАРСАВЕТ ПРЫМАЎ СЛАБЫ УДЗЕЛ У ВЫРАШЭНЬНІ ЗАДАЧ ВЫКАНАНЬНЯ ПРАМФІНПЛАНУ І РАБОЧАГА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ

ЦП саюзаў не давялі каляндарны план справаздачнай кампаніі да заводаў—у выніку ў першы-ж дзень адбыліся сходы на 4 прадпрыемствах

Прафэсыянальныя арганізацыі сарвалі справаздачныя сходы

1-га студзеня не адбыліся справаздачныя сходы ў 1-ай друкарні імя Сталіна, на вымарнай фабрыцы, на грунтовае адзіночак саюзу харчавікоў і па калектыве рабочых - будаўнікоў ваннаведу і Белкалгасбуду. Дакладчыкі, вылучаныя гарсаветам, якія зьявіліся рабіць справаздачы перад выбаршчыкамі, вымушаны былі пайсьці ні з чым, бо прафарганізацыі ня склікалі нават сходаў рабочых. На запытаньне рэдакцыі, чаму сарваны сход у друкарні імя Сталіна, старшыня заўкому заявіў: «Паводле каляндарнага пляну ў нас учора адбывалася канфэрэнцыя ўдарнікаў, прысьвечаная падвядзеньню вынікаў ударнага кварталу, а справаздачны сход павінен быць скліканы 8-га студзеня — такая дырэктыва ЦП саюзу».

Такім чынам, з-за блытаніны, дапушчанай прафсыянальнымі арганізацыямі, сарваліся першыя выбарчыя сходы на радзе прадпрыемстваў гораду. ЦП саюзаў друкароў, гарбароў і інш. прыслалі сваім візавым органам першапачатковыя арыентовачныя планы скліканьня справаздачных сходаў і не паклапаціліся аб давядзеньні да прадпрыемстваў каляндарнага пляну, выпрацаванага гарадзкой выбарчай камісіяй. Каляндарныя пляны былі ў колькасьці 350 экз. перададзены саюзам для рассылкі па ўсіх выбарчых вучастках гораду, але яны, напэўна, засталіся ляжаць у сталах саюзных канцылярый. Напрыклад, паводле пляну, прысланага ЦП саюзу, справаздачны сход рабочых друкарні і работнікаў рэдакцыі «Зьвязды» павінен адбыцца 7-га студзеня, паводле-ж каляндарнага пляну гарадзкой выбарчай камісіі сход прызначан на 4-га студзеня.

За гэту блытаніну, якая выклікала зрыў справаздачных сходаў і парушэньне пляну, пясуць поўную адказнасьць прафсыянальныя арганізацыі, якія не паклапаціліся давесьці каляндарны план сходаў да прадпрыемстваў і ўстаноў, а таксама гарадзкая выбарчая камісія, якая не праверыла, як прафсыянальныя арганізацыі выконваюць дырэктывы аб давядзеньні плянаў.

Трэба неадкладна ўрэгуляваць гэта пытаньне і не дапушчаць далейшай блытаніны.

Б.

Апошні сход на «Камунары»

На справаздачным сходам на заводзе «Камунар» адбыўся карнавал, у якім прымалі ўдзел дзеці падшэфнай школы. Карнавальны лёзунг склікалі да 100 проц. яўкі на справаздачны сход.

Прыйшло 90 проц. агульнага рабочых першай зьмены такарнага цэху.

Справаздачны даклад зрабіў старшыня гарсавету — тав. Аксючыц. Было зала больш 50 пытаньняў; у спрэчках выступіла 20 чал. Пад канец трэл была ўзята работа жорсткі галіне рабочага забесьпячэньня гарсавет гаварылі аб перабоях у забесьпячэньні дрывамі і гародніной.

Рабочы адзначалі невыстарчальную элефікацыю рабочых акраін, прывёз прыклады «жартаў» Эльводу.

Падкрэсьлівалі слабы кантроль гарсавету над гандлёўцтвам у горадзе (прыклад: пінак кіно «Чырвоная Зорка» замяў вуліцу). У спрэчках адзначана, што гарсавет прымаў слабы ўдзел у калектывізацыі грэйгарадніх сялянскіх гаспадарак. Выступаўшы прапанавалі, каб гарсавет больш та рабіў справаздачы перад выбаршчыкамі і пры дапамозе рабочых выяўляў памылкі.

Апошні пленум Менгарсавету

31-га сьнежня быў апошні пленум Менгарсавету XII-га скліканьня. Са справаздачнай аб рабоце гарсавету выступіў старшыня савету тав. Аксючыц.

У сваім дакладзе т. Аксючыц падрабязна спыніўся на пасобных галінах работы гарсавету, адстрыўшы пытаньне аб тым, як савет ажыцьцяўляў генэральную лінію партыі, як здавальняў ён гаспадарчыя культурныя запатрабаваньні рабочых.

За справаздачны перыяд здачна вырасла прамысловасьць г. Менску, асабліва ва мэталапрацоўцы і швэйная. Колькасьць рабочых з 30 тыс. чал. у 1928 г. павялічылася да 1[illegible]. Да 1-га лістапада г. г. спрацуе. Тав. Аксючыц падрабязна характарызаваў становішча рабочага забесьпячэньня, меры, прынятыя гарсаветам на забесьпячэньні працоўных родзінай, дрывамі і г. д.

Вялікае дасягненьне гарсавету XII-га скліканьня—пабудова ў горадзе дзе, які за час свайго існаваньня перавёз каля 11 млн. пасажыраў.

Па дакладу разгарнуўся спрэчкі. Пленум зацьвердзіў справаздачу гарсавету.

Першы сход на «Камунары»

На справаздачным сходам на заводзе «Камунар» адбыўся карнавал, у якім прымалі ўдзел дзеці падшэфнай школы. Карнавальны лёзунг склікалі да 100 проц. яўкі на справаздачны сход.

Прыйшло 90 проц. агульнага рабочых першай зьмены такарнага цэху.

Справаздачны даклад зрабіў старшыня гарсавету — тав. Аксючыц. Было больш 50 пытаньняў; у спрэчках выступіла 20 чал. Пад канец трэл была ўзята работа жорсткі галіне рабочага забесьпячэньня гарсавет гаварылі аб перабоях у забесьпячэньні дрывамі і гародніной.

Рабочы адзначалі невыстарчальную элефікацыю рабочых акраін, прывёз прыклады «жартаў» Эльводу.

Падкрэсьлівалі слабы кантроль гарсавету над гандлёўцтвам у горадзе (прыклад: пінак кіно «Чырвоная Зорка» замяў вуліцу). У спрэчках адзначана, што гарсавет прымаў слабы ўдзел у калектывізацыі грэйгарадніх сялянскіх гаспадарак. Выступаўшы прапанавалі, каб гарсавет больш та рабіў справаздачы перад выбаршчыкамі і пры дапамозе рабочых выяўляў памылкі.

Апошні пленум Менгарсавету

31-га сьнежня быў апошні пленум Менгарсавету XII-га скліканьня. Са справаздачнай аб рабоце гарсавету выступіў старшыня савету тав. Аксючыц.

У сваім дакладзе т. Аксючыц падрабязна спыніўся на пасобных галінах работы гарсавету, адстрыўшы пытаньне аб тым, як савет ажыцьцяўляў генэральную лінію партыі, як здавальняў ён гаспадарчыя культурныя запатрабаваньні рабочых.

За справаздачны перыяд здачна вырасла прамысловасьць г. Менску, асабліва ва мэталапрацоўцы і швэйная. Колькасьць рабочых з 30 тыс. чал. у 1928 г. павялічылася да 1[illegible]. Да 1-га лістапада г. г. спрацуе. Тав. Аксючыц падрабязна характарызаваў становішча рабочага забесьпячэньня, меры, прынятыя гарсаветам на забесьпячэньні працоўных родзінай, дрывамі і г. д.

Вялікае дасягненьне гарсавету XII-га скліканьня—пабудова ў горадзе дзе, які за час свайго існаваньня перавёз каля 11 млн. пасажыраў.

Па дакладу разгарнуўся спрэчкі. Пленум зацьвердзіў справаздачу гарсавету.

Прафэсыянальныя арганізацыі сарвалі справаздачныя сходы

1-га студзеня не адбыліся справаздачныя сходы ў 1-ай друкарні імя Сталіна, на вымарнай фабрыцы, на грунтовае адзіночак саюзу харчавікоў і па калектыве рабочых - будаўнікоў ваннаведу і Белкалгасбуду. Дакладчыкі, вылучаныя гарсаветам, якія зьявіліся рабіць справаздачы перад выбаршчыкамі, вымушаны былі пайсьці ні з чым, бо прафарганізацыі ня склікалі нават сходаў рабочых. На запытаньне рэдакцыі, чаму сарваны сход у друкарні імя Сталіна, старшыня заўкому заявіў: «Паводле каляндарнага пляну ў нас учора адбывалася канфэрэнцыя ўдарнікаў, прысьвечаная падвядзеньню вынікаў ударнага кварталу, а справаздачны сход павінен быць скліканы 8-га студзеня — такая дырэктыва ЦП саюзу».

Такім чынам, з-за блытаніны, дапушчанай прафсыянальнымі арганізацыямі, сарваліся першыя выбарчыя сходы на радзе прадпрыемстваў гораду. ЦП саюзаў друкароў, гарбароў і інш. прыслалі сваім візавым органам першапачатковыя арыентовачныя пляны скліканьня справаздачных сходаў і не паклапаціліся аб давядзеньні да прадпрыемстваў каляндарнага пляну, выпрацаванага гарадзкой выбарчай камісіяй. Каляндарныя пляны былі ў колькасьці 350 экз. перададзены саюзам для рассылкі па ўсіх выбарчых вучастках гораду, але яны, напэўна, засталіся ляжаць у сталах саюзных канцылярый. Напрыклад, паводле пляну, прысланага ЦП саюзу, справаздачны сход рабочых друкарні і работнікаў рэдакцыі «Зьвязды» павінен адбыцца 7-га студзеня, паводле-ж каляндарнага пляну гарадзкой выбарчай камісіі сход прызначан на 4-га студзеня.

За гэту блытаніну, якая выклікала зрыў справаздачных сходаў і парушэньне пляну, пясуць поўную адказнасьць прафсыянальныя арганізацыі, якія не паклапаціліся давесьці каляндарны план сходаў да прадпрыемстваў і ўстаноў, а таксама гарадзкая выбарчая камісія, якая не праверыла, як прафсыянальныя арганізацыі выконваюць дырэктывы аб давядзеньні плянаў.

Трэба неадкладна ўрэгуляваць гэта пытаньне і не дапушчаць далейшай блытаніны.

Б.

Як выкананы прапановы рабочых да наказу

Прэзыдыум Менгарсавету праверыў, як выканалі гарадзкія ўстановы дадаткі рабочых сходаў да наказу гарсавету XII-га скліканьня.

Поўнасьцю выкананa 58 проц. прапаноў, часткова—15 проц., нявыкана—27 проц. (з іх 13 проц., якіх нельга было ажыцьцявіць).

Найбольшы процант выкананых дадаткаў прыходзіцца на антырэлігійныя пытаньні—80 проц. і адміністрацыйныя—77 проц. Горш за ўсё выкананы рабочыя прапановы ў галіне ахматмпладу—16 проц., камунальнай гаспадарцы—44 проц., асьветы—45 проц.

Аддзелы і гарадзкія ўстановы слабо кіраваліся дадаткамі да наказу ў сваёй штодзённай рабоце. Зусім не аддалі ўвагі рабочым прапановам кіраўнікі камгасу і аддзелу асьветы, якія чыста фармальна аднесьліся да гэтай справы.

Сацыялістычная пераклічка на лепшы ўдзел у перавыбарах

БАБРУЙСК. (Наш кар.). 30-га сьнежня швэйная фабрыка імя Дзяржынскага паладзіла дэманстрацыю—агітацыйную вылазку ў горад, прысьвечаную перавыбарам гарсавету і вынікам вытворчага пітурму. Да перавыбараў выпушчан спэцыяльны фабрычны бюлетэнь, па цэхах выдаюцца «Ільлічоўкі».

Сярод рабочых фабрыкі ўжо сабрана 100 прапаноў да новага наказу. На агульных сходах рабочых, дзе былі пастаўлены даклады аб значэньні перавыбараў, заключаны сацыяборніцтвы паміж пасобнымі агрэгатамі на лепшы ўдзел у перавыбарах. Лепшыя агрэгаты будуць прэміраваны.

Швэйная фабрыка заключыла сацыялістычны дагавор з машынабудаўнічым заводам імя Сталіна па бальшавіцкае правядзеньне перавыбараў гарсавету.

Холад прагнаў выбаршчыкаў

На 1 студзеня быў склікан справаздачны сход на футравай фабрыцы імя 1-га мая. Заслухалі справаздачу гарсавету, але спрэчкі адклалі. Прычына: з-за холаду нельга было праводзіць сход, рабочыя пачалі разыходзіцца.

Заўком надбайна аднёсься да падрыхтоўкі сходу, дапусьціў, каб ён праводзіўся ў неапаленым памяшканьні. Зараз прыдзецца праводзіць яшчэ адзін сход, на якім заслухаць спрэчкі па дакладу.

У.

М. ПОТАШ

Бальшавізм і дробна-буржуазныя партыі на Беларусі ў эпоху рэвалюцыі 1905 г.

Мы ня думаем у гэтым артыкуле даць выклад канцэпцыі хоць разьвіцьця бальшавізму і дробна-буржуазных партый[1]) на Беларусі ў 1905 г. Наша мета зводзіцца да таго, каб праз супастаўленьне некаторых асноўных палажэньняў з тэорыі-практыкі бальшавізму, якую ён адыграў у гэтых партый паказаць іх пастаянную ролю ў рэвалюцыі 1905 г. і тая класавая імкнецілі, якія зьяўляюцца крыніцамі ў іх дзейнасьці. Важнасьць такой пастаноўкі пытаньня ясна. Мы маем установу нацыянал-дэмократаў, эўрэйскіх і беларускіх, якая прабуе даказаць, што Бунд, БСГ нібы зьяўляліся напрэдніками бальшавізму на Беларусі і што апошні перанёс сваё «сонца» гэтых партый. Адначасова яны сальдыфікуюць, што Савецкая Беларусь зьяўляецца ажыцьцяўленьнем ідэалаў гэтых партый. Гэтыя сальдыфікацыі зьяўляюцца ў руках нацдэмаў прыладай іх растэўватарскіх мадзіў і павінны служыць прыкрыцьцем буржуазна-кулацкіх карэньняў нацдэмаўскай ідэалёгіі і яе палітычнай платформы.

Вось чаму вельмі важна выявіць усю бедасьць, якая сядзеньне прынцыпы бальшавізму, як рэвалюцыйнай тэорыі і практыкі пралетарыяту, ад погляду Бунду і БСГ, як дробна-буржуазных партый ужо ў рэвалюцыі 1905 г.

Значэньне рэвалюцыі 1905 г. вялізнае. Недарма-ж тав. Ленін пісаў, што «без генэральнай рэпэтыцыі 1905 г. перамога Кастрычніцкая рэвалюцыі 1917 г. была-б немагчыма». І з прычыны гэтага тэзісы Культпропу ЦК і Інстытуту Леніна зусім правільна гаворыць: «што сучасная палітыка нашай партыі і яе ленінскага ЦК ёсьць разьвіцьцё і практыка у новай абстаноўцы тэорыі і практыкі бальшавізму».

З другога боку, далейшая—часьці рэвалюцыі 1905 г. — эвалюцыя Бунду і БСГ, як і іншых дробна-буржуазных партый, выкрывае з выстарчальнай ясьцьцю сапраўдную клясавую існасьць гэтых партый. Паказаць іх ідэйны твар у рэвалюцыі 1905 г. мае вялікае практычнае значэньне і для сучаснасьці.

I. БАЛЬШАВІЗМ

1.

Калі мы гаворым аб бальшавізме на Беларусі ў эпоху рэвалюцыі 1905 г., мы маем на ўвазе імёны для бальшавіцкіх групы і пасобных бальшавікоў, што былі ва ўсіх самых-дэмакратычных групах і арганізацыях таго часу. Мы падкрэсьліваем гэты момант, бо, ня гледзячы на тую акалічнасьць, што бальшавікі і меншавікі ў эпоху рэвалюцыі 1905 г. ўзнаўлялі фармальна ў адну партыю, арыгінальныя разьвіцьцяні паміж імі ў праграмных, тактычных і г. д. пытаньнях былі настолькі глыбокія, настолькі сур'ёзныя, што можна правесьці паміж імі вялізарнае. Дзе з аднаго боку знаходзіцца бальшавізм—партыя пралетарыяту, а з другога боку — апартуністычная дробна-буржуазная партыя меншавікоў.

[1]) З дробна-буржуазных партый мы бярём толькі «Бунд» і «БСГ». На тэрыторыі Беларусі, як вядома, існавалі і ад іншых дробна-буржуазных партый. Але мы спынемся толькі на тых, якія маюць найбольшае значэньне для ідэйнага руху на Беларусі ў 1905 г.

У Беларусі-ж арганізацыі РСДРП у радзе месц былі яшчэ да рэвалюцыі 1905 г. доўгі мінулае. Вось чаму там у радзе арганізацый не заўсёды выразным было разьмежаваньне паміж бальшавікамі і меншавікамі. Гэта былі пераважна пасобныя наводле свайго ідэйнага кірунку арганізацыі. У другіх арганізацыях ужываліся разам і бальшавікі і меншавікі. У некаторых арганізацыях іх фізіяномія ў францыўных адносінах мянялася. Трэба адзначыць, што нават у крайніх цэнтрах мела месца прымірэнцтва. Нямала дапамагала ўжываньню разам бальшавікоў з меншавікамі і неафармленасьць іх фракцыйнага разьмежаваньня, **найяўнасьць мноства нацыяналістычных дробна-буржуазных партый**, на змаганьне з якімі групы РСДРП павінны былі аб'ядноўваць і канцэнтраваць усе свае сілы. Характэрна ў гэтых адносінах наступнае месца ў карэспандэнцыі з Менску: «У Менскай групе ёсьць і «бальшавікі» і «меншавікі». Ужываюцца разам яны адны з другімі мірна, і гэтым у значнай ступені аб'ясьняецца моцнае работы. Трудна сабе прадставіць, які канфлікт вынікаў-бы, калі-б у групе адбыўся раскол; у групы даволі ёсьць зьнешніх ворагаў [2]). Аб тым-жа піша тав. Дыманштэйн, гаворачы аб партыйных арганізацыях РСДРП у раёне Бунду: «Калі-б нашы назначныя партыйныя сілы мы прысьвяцілі міжфракцыйнаму змаганьню, дык мы-б зусім зьнясьлілісь» [3]).

Пя гледзячы на ўсё гэта, уплыў бальшавізму ў эпоху рэвалюцыі 1905 г. быў вельмі значны. Той-жа тав. Дыманштэйн піша аб партыйных арганізацыях РСДРП у Паўноч.-Зах. краі: «у агульным-жа трэба сказаць, што там пераважаў бальшавіцкі настрой. Заўзятым меншавікам ходу не давалі, яны звычайна выступалі пад выглядам нефракцыйных або на справе праўялі сябе рэвалюцыйна, не парушаючы агульных пастаноў арганізацыі, напаравуючыся дысцыпліне» [4]). У арганізацыях РСДРП працавалі даволі відныя бальшавікі, якія накіроўвалі ўсе сілы на тое, каб надаць рабоце гэтых арганізацый бальшавіцкі кірунак. Некаторыя арганізацыі былі яўна бальшавіцкія (як Менская, напрыклад). І ў тых арганізацыях, якія нельга назваць бальшавіцкімі, былі там бальшавікі пашыралі ідэі бальшавізму, процідзіўчы іх меншавізму. Характэрна наступнае месца ў карэспандэнцыі з Віцебску аб адной манифэстацыі, арганізаванай групай: «Цікава адзначыць,—піша карэспандэнт,—што мясцовыя «меншавікі», якія нападаюць на ідэю ўсяных шляхаў, самым старанным спосабам расхраноўвалі плян гэтага выступленьня... Так вялікі настаўнік—зьяцьцё крыху-па-крысе пазучае кідаць «тактыку—працэс» і тых таварышоў, якіх адно імя «бальшавік» прыводзіць амаль ці ня ў нэрвовы стан» [5]). З гэтага мы бачым, як даволі

[1]) «Пролетарий» № 19 ад 3 кастрычніка 1905 г.

[2]) С. Дыманштэйн. «Рендвижение среди евреев». 1905 г. III т., вып. I, стар. 157.

[3]) Там-жа, стар. 157.

[4]) «Пролетарий» № 18 ад 26 верасьня 1905 г.

[5]) Ленін. Т. XIX, стар. 16. ГИЗ. 1925 г.

вострая ужо ставілася пытаньне аб бальшавізме і меншавізме ў гэтай арганізацыі. Менская-ж арганізацыя, былушая, як мы ўжо гаварылі, бальшавіцкай, знаходзілася ў аналогі Паўн.-Зах. камітэту за яго прымірэнцкую лінію ў першыя III зьезду партыі. Меншавізм, працялюючы сваё ужо ў рэвалюцыі 1905 г., стаў асабліва ўзмацняцца ў Беларусі і выстаўляць свой сапраўдны дробна-буржуазны, апартуністычны твар ужо на выходзе рэвалюцыі, у эпоху рэакцыі і далей.

Такім чынам мы бачым, што і ў адсталай у прамысловых адносінах Беларусі, апіраючыся на найбольш перадавыя клясава-сьвядомыя пласты рабочых, пачаў складацца бальшавізм і арганізоўваць найлепшую часьць кольнасна і якасна слабога пралетарыяту Беларусі для выкананьня тых задач, якія сталі перад рабочай клясай ва ўсёй тагачаснай Расійскай імпэрыі.

Але што бальшавізм нёс рабочай клясе Беларусі, заклікаючы яе арганізоўвацца пад свае сьцягі?

Перш за ўсё рэвалюцыйную марксыцкую тэорыю і згуртаваную на яе аснове бальшавіцкую праграму, з якой вынікала і тактыка пралетарыяту ў рэвалюцыі 1905 г. Вучэньне аб характары рэвалюцыі 1905 г., аб яе рухоўных сілах, тактычных праблем у рэвалюцыі,—усё гэта павінна было прызвесьці пралетарыят і, пад яго кіраўніцтвам і сялянства, да давядзеньня да канца буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі і да поўнай перамогі над самаўладзтвам. Ня ставячы сабе задачай у гэтым артыкуле вынесьціць бальшавіцкае разуменьне рэвалюцыі 1905 г. і яго тактычных асноў, мы аднак лічым патрэбным адзначыць некаторыя моманты, якія маюць для нашай мэты вялікае значэньне. Гэта, напершае, выразная марксыцка-ленінская пастаноўка пытаньня аб гегемоніі пралетарыяту, як адзіна пасьлядоўнай да канца рэвалюцыйнай клясы, і распрацоўка пытаньня аб кіраўніцтве з боку пралетарыяту сялянствам і паасобнымі яго групамі на розных этапах рэвалюцыі; падругое, настаянны ўлік і высоўваньне самастойных задач пралетарыяту. Акрэсьліваючы аб'ектыўныя задачы рэвалюцыі 1905 г., як задачы поўнага зьніштажэньня прыгоньніцтва і самаўладзтва, адкрываючага свабодны шлях разьвіцьцю капіталізму, і выстаўляючы ў сувязі з гэтым у цэнтры рэвалюцыйнае вырашэньне аграрнага пытаньня—бальшавізм разглядаў вырашэньне ўсіх гэтых задач толькі як неабходны этап да далейшага змаганьня, якое паложыць пачатак сацыялістычнай рэвалюцыі. Вось чаму Ленін так выразна пастаўў пытаньне аб пераразтаньні аднаго этапу рэвалюцыі ў другі ўжо ў эпоху рэвалюцыі 1905 г. Ён пісаў: «У рэвалюцыйнай дэмакратычнай дыктатуры пралетарыяту і сялянства ёсьць, як і ва ўсяго на сьвеце, мінулае і будучыня. Яе мінулае — самаўладзтва, прыгонніцкая манархія, прывілеі... Яе будучыня—змаганьне супроць прыгонных уласнасьці, змаганьне наёмнага рабочага з гаспадаром, змаганьне за сацыялізм». У сувязі з гэтым трэба адзначыць і пастаноўку пытаньня аб дзьвюх сацыяльных войнах у сялянстве. Адна—гэта вайна ўсяго сялянства супраць сельскай буржуазіі і пралетарыяту і поўпралетарскімі элементамі. Гэтыя кароткія заўвагі нам асабліва спатрэбяцца, калі мы падойдзем да аналізу сутнасьці погляду БСГ. Але цяпер наўстаю пытаньне, як-жа прыстасавалі погляды бальшавізму да той абстаноўкі, што была ў эпоху першай рускай рэвалюцыі на Беларусі? Ці давалі яны адказ на патрэбнасьці далейшага сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця Беларусі?

Да адказу на гэта пытаньне мы цяпер і пяройдзем.

II.

У адным з сваіх артыкулаў Ленін пісаў: «Ва Ўсходняй Эўропе (Аўстрыя, Балканы, Расія) да гэтага часу не пазбыты яшчэ матучныя рэшткі сярэднявякоўя, страшэнна затрымліваючыя грамадзкае разьвіцьцё і рост пралетарыяту. Гэтыя рэшткі—абсалютызм (неабмежаваная самадзяржаўная

Сёньня ў Маскве пачынаецца „ТЫДЗЕНЬ САВЕЦКАЕ БЕЛАРУСІ“

Пакажам працоўным СССР, як Савецкая Беларусь, пад кіраўніцтвам партыі Леніна, у цесным саюзе і пры дапамозе пралетарыяту і працоўных брацкіх саюзных рэспублік ідзе шпаркімі крокамі па шляху сацыялістычнага будаўніцтва

У змаганьні супроць клясавых ворагаў і іх агентаў—правых і „левых“ апартуністаў, вялікадзяржаўных шавіністаў, беларускіх нацыянал-дэмакратаў і шавіністаў усіх колераў пралетарыят і працоўныя і надалей будуць умацоўваць магутнасьць БССР--фарпост Савецкага Саюзу



Лепшы ўдарнік заводу «Камунар» т. ПАЛЯКОЎ.

Дэлегацыя БССР выехала ў Маскву

Учора ўвечары ў доме Камуністычнае Асьветы сабраліся ўдзельнікі тыдню Савецкае Беларусі ў Маскве.

Тут лепшыя ўдарнікі, калгасьнікі, пісьменьнікі, навуковыя працаўнікі, артысты.

Тав. Стракоўскі ад імя ўрадавай камісіі па арганізацыі «тыдню» адкрывае пасяджэньне:

— Працоўныя Беларусі атрымалі запрашэньне ад пралетараў чырвонай сталіцы паказаць свае грандыёзныя посьпехі па будаўніцтве пралетарскай культуры, па індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Далей выступіў тав. Сянкевіч, які ўнёс прапанову, каб дэлегацыя абвясьціла сябе ўдарнай брыгадай па азнаямленьні пралетараў Масквы з посьпехамі на сацыялістычным будаўніцтве Савецкай Беларусі.

Прапанова тав. Сянкевіча сустракае адназгоднае ўхваленьне.

Учора з Менску ў Маскву выехала беларуская дэлегацыя ў складзе больш за 200 чал.

Адначасова з Віцебску выехаў Першы Беларускі Дзяржаўны Тэатр.

Жывем, як адна сям'я

На руінах саматужнай гарбарні мы, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пабудавалі новую прыгожую гарбарню імя Сталіна. Зараз на заводзе—600 чал. Калі перайшлі на новы завод (у 1930 годзе), мы арганізавалі 52 ударныя брыгады і адну «сквозную». Праграму ўдарнага кварталу мы выканалі на 103,5 проц. у цэннасным азначэньні і на 100 проц. —у колькасным. Заданьне па зьніжэньні сабекошту перавыканалі на 3 проц.

Сталоўка пры заводзе ня кепска забясьпечвае рабочых .Скончана пабудова пасёлку на 250 кватэр.

У нас на заводзе 75 проц. яўрэяў, і мы жывем з імі, як адна сям'я, бо ТОЛЬКІ ПРЫ САВЕЦКАЙ УЛАДЗЕ ПРАВІЛЬНА ВЫРАШАНА НАЦПЫТАНЬНЕ. А ў стары час самі гаспадары ўсе сілы намагалі на тое, каб унесьці нацыянальны разлад у сям'ю рабочых, бо ім гэта патрэбна было для таго, каб адцягнуць увагу рабочых ад рэвалюцыйнага руху.

Мы-ж будуем сваю культуру — пралетарскую па зьмесьце і нацыянальную по форме. У нас арганізаваны розныя гурткі, у якіх вучацца ўсе рабочыя. У адказ шкоднікам «прампартыі» і на вылазкі беларускіх нацыянал-дэмакратаў рабочыя заводу дадаткова падпісаліся на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады» на 6.000 рублёў. 11 лепшых ударнікаў перададены ў партыю.

Мы ўсе абяцаем партыі змагацца з розными ўхілами ад генэральнай лініі, абяцаем змагацца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну трэцяга году пяцігодкі.

Удзельнік дэлегацыі БССР у Маскву — НЕСЬЦЕРАЎ, рабочы стаж 25 год.

Ад маленькага саматужнага заводу—да чырвонасьцяжнага гіганта

Рост БССР—вынік правільнай Ленінскай нацыянальнай палітыкі

РАПАРТ ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ УсеКП(б) і ЦВК СССР

на рабочых, работніц, інжынэрна-тэхнічнага персаналу і служачых менскага чырвонасьцяжнага скурзаводу „БАЛЬШАВІК“

Сіламі ўдарнікаў нашага заводу, пры поўным падтрыманні рабочае клясы нашага Савецкага Саюзу, мы з маленькіх саматужных скураных заводаў вырасьлі ў магутны чырвонасьцяжны скураны завод з праграмай выпрацоўкі на 13.000.000 руб. на 1931 г.

Такі гігантскі рост быў магчымы толькі дзякуючы ленінскай нацыянальнай палітыцы, якая цьвёрда праводзілася нашай Усесаюзнай камуністычнай партыяй, і якая накіравана на рашучае адтрыманьне, на стымуляваньне эканамічнага ўздыму адсталых, раней прыгнечаных царызмам нацыянальнасьцяй.

Толькі дзякуючы непрымірымай барацьбе нашае партыі за Ленінскае вырашэньне нацыянальнага пытаньня, супроць бундызму і люксэмбургіянства, супроць нацыянал - апартунізму, супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, і супроць мясцовых шавінізмаў — БССР здолела дабіцца рашаючых посьпехаў у правядзеньні нацыянальнай палітыкі.

У першай палове 29-30 г. мы дапусьцілі рад вялікіх прарываў у выкананьні прамфінпляну.

Але ў сакавіку, калі выкананьне прамфінпляну зьнізілася да самай нізкай ступені, ударнікі нашага заводу рашуча павярнулі сваю працу, не дапусьцілі завод да ганьбы і зрабілі карэнны пералом ва ўсёй рабоце заводу.

У сучасны момант, **у тыдзень агляду культурнага і матар'яльнага росту нашае БССР**, мы маем магчымасьць дэманстраваць перад рабочай клясай усяго Савецкага Саюзу і свае дасягненьні.

Ужо да канца 1929-30 г. у 4-м квартале выкананьне прамфінпляну ў колькасных адносінах складала 132,94 проц., у адносінах каштоўкасьці 135,86 проц., зьніжэньне сабекошту дасягнула 13,69 проц., прадукцыйнасьць працы ўзрасла да 111,2 проц.

На 20 рабочых прапановах, якія былі праведзены ў жыцьцё, атрымана фактычная эканомія 14.659 р. 80 кап., па другіх рабочых прапановах, якія ўнесены пры складаньні сустрэчнага прамфінпляну на 1930-31 г., сустрэчных прамфінпляну і рацыяналізатарскага разьліку на 1931 г., будзе атрымана 94.438 руб. 32 кап. эканоміі.

147 лепшых ударнікаў прэміраваны на суму 8.510 руб.

З агульнага ліку 800 рабочых на заводзе мы маем 573 ударніка, якія арганізаваны ў 39 ударных брыгад і 17 «сквозных».

На ўдарны квартал наш завод уступіў у беларускі і Усесаюзны конкурс на лепшае выкананьне прамфінпляну.

Ударнымі бальшавіцкімі тэмпамі **мы 28-га сьнежня датэрмінова выканалі прамфінплян на 103,4 проц. у колькасных адносінах і ў адносінах каштоўнасьці на 100,92 проц.**

Замест вызначанага наводле пляну зьніжэньня сабекошту ў 8,03 проц. мы дабіліся значна большага зьніжэньня сабекошту. Мы дабіліся таксама і значнага паляпшэньня якасьці выпусканай прадукцыі.

Агульная сума падпіскі на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады» дасягнула 41.055 руб., што складае 112,77 проц. заданьня.

Усе гэтыя посьпехі сталі магчымы толькі дзякуючы цьвёрдаму кіраўніцтву ленінскага Цэнтральнага Камітэту нашае партыі і бязьлітаснай барацьбы супроць правага ўхілу, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, супроць «левых» загібаў, супроць бяспрынцыпнага права - «лявацкага» блёку, які стварыўся на пляцформе правых.

На аснове вывучэньня генэральнае лініі партыі, вывучэньня пастаноў 16-га зьезду партыі мы за ўдарны квартал паслалі ў партыю 48 лепшых вытрыманых ударнікаў для барацьбы за ажыцьцяўленьне генэральнае лініі партыі ў словасьці нашае Беларусі, імкнецца шляхам загатоўчай забастоўкі пазбавіць нас магчымасьці скарыстаць усе вытворчыя рэсурсы нашых заводаў.

Для барацьбы з клясавым ворагам мы паслалі даўже рабочыя брыгады з лепшых ударнікаў для працы на вёсцы і не паслабім сваёй барацьбы пакуль ня зломім кулацкага супраціўленьня нашым дзяржаўным загатоўкам.

Мы таньбім і патрабуем жорсткага пакараньня контр - рэвалюцыйнай групы нацыянал - фашыстаў, былых міністраў, якія імкнуліся перашкодзіць сацыялістычнаму будаўніцтву, хацелі прадаць БССР капіталістычнаму сьвету, упрагчы ў ярмо капіталістычнае эксплеатацыі мільёны рабочых і сялян, падрыхтоўвалі інтэрвэнцыю, каб у патоках крыві ўтапіць БССР.

Пастановы аб'яднага сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б)Б правільна, па-ленінску накіроўваюць рабочую клясу і працоўнае сялянства па далейшую барацьбу ў 3-ці рашаючы год пяцігодкі, год завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнае эканомікі СССР.

Мы даем цьвёрдае абяцаньне змагацца ўсімі сіламі за ажыцьцяўленьне генэральнае лініі партыі.

Няхай жыве беларуская нацыянальна-палітычна!

Няхай жыве беларуская культура нацыянальная па форме і пралетарская па сутнасьці!

Няхай жыве салідарнасьць і агульная барацьба пралетарыяту ўсяго сьвету!

Няхай жыве сусьветная пралетарская рэвалюцыя!

Няхай жыве Ленінскі ЦК УсеКП(б)!

Няхай жыве штаб сусьветнай рэвалюцыі — Камінтэрн!

Няхай жыве правадыр нашае партыі — тав. Сталін!

Не пакінем саўгас да канца пяцігодкі!

У саўгасе імя Чарвякова — 130 рабочых. Усе зьяўляюцца ўдарнікамі. У пачатку было зямлі ў саўгасе 300 гэкт. А зараз саўгас пашырыўся да 900 гэкт. Мае 300 валоў, каля 40 коняй, 250 кароў, трактар, 2 аўтабусы, бровар і г. д.

У часе ўборачнай кампаніі рабочыя саўгасу працавалі па-ўдарнаму, ня лічыліся з выхаднымі днямі, добра справіліся з уборкай і паслалі яшчэ брыгаду ў 25 чал. у дапамогу калгасам. Засіласавалі кармоў 2 ямы.

Побач з ростам саўгасу расьце і культурны ўзровень рабочых. У клюбе і чытальні рабочыя ліквідуюць сваю няпісьменнасьць і малапісьменнасьць.

Жыльлёвае пытаньне ў нас ужо вырашана, усе кватэры адрамантаваны, а зараз капчаем будаваць дом на 8 кватэр.

Плян асеньняй пасеўнай кампаніі выкапан на 100 проц., а па зяблеве перавыкананы. За лепшую работу 40 ударнікаў атрымалі прэміі.

Усе старыя рабочыя далі абавязацельствы **не пакідаць саўгас да канца пяцігодкі.** Нашы посьпехі кажуць, што генэральная лінія партыі **правільная.**

Член дэлегацыі БССР — **Антаніна Недапытальская**, вытв. стаж 10 год.

Паны нас добра памятаюць

Маёнтак «Прыпукі» бела-палякі пры адступленьні спалілі. Усе маёмасьць была адабрана і прадана кулацкім гаспадаркам. Пасьля адступленьня беларусаў-палякаў невялікая частка рабочых узялася адбудоўваць маёнтак.

Зараз наш саўгас мае садова-гародны і жывёлагадоўчы ўхіл, у гэтым напрамку мы маем вялікія посьпехі: 28 коняй, 200 кароў, 50 штук мае ладняка. Апрача таго ў нас ёсьць свой трактар. Мы скончылі сваячасова ўборку, перавыканалі плян пасеўнай кампаніі, засеялі 3 гэкт. звыш пляну. Пад гародамі ў нас 32 гэкт. і 40 гэкт саду. Ураджайнасьць у параўнаньні з мінулым годам павялічылася на 23 проц.

Матар'яльнае становішча рабочых з кожным днём паляпшаецца. Культурна-выхаваўчая работа сярод рабочых саўгасу разгорнута здавальняюча. ДАЎНЕЙ БАТРАК НЯ ЛІЧЫЎСЯ ЧАЛАВЕКАМ, А ЗАРАЗ МЫ САМІ БУДУЕМ ДЛЯ СЯБЕ ШЧАСЬЦЕ.

«Прыпукі» вялі з бела-польскімі бандамі жорсткае змаганьне, і шмат лепшых рабочых загінула на палёх бою, але паны добра памятаюць нас і, калі яны зноў захочуць на нас снапасьці, МЫ ГАТОВЫ ДА АБАРОНЫ. Нашу гатоўнасьць рабочыя саўгасу падмацавалі падпіскай на пазыку на ўсе 100 проц. месячнай пэнсіі. У часе ўборкі і асеньняй пасеўнай кампаніі ў нас ня было ніводнага прагулу. Усе пляны мы абмяркоўвалі на вытворчых нарадах і агульных сходах і таму мы маем вялікія дасягненьні.

УДЗЕЛЬНІК ДЭЛЕГАЦЫІ БССР — ЛЮБЭРТ, ВЫТВОРЧЫ СТАЖ 38 ГОД.

У агні клясавай барацьбы

расьце і мацнее калгасная Беларусь

У дзень усесаюзнага агляду БССР, мы, дэлегацыя калгасьнікаў Беларусі, шлем гарачае прывітаньне камуністычнай партыі ў асобе яе ленінскага ЦК, рабочай клясе, калгасьнікам і ўсім працоўным Савецкага Саюзу.

У агні клясавай барацьбы расьце і мацнее калгасны рух Савецкай Беларусі. Бядняцка- серадняцкія масы БССР па прыкладзе саўгасаў і калгасаў пераканаліся ў перавагах буйнога сацыялістычнага зямляробства і тысячамі кідаюць свае дробныя індывідуальныя палоскі.

Да 1-га кастрычніка 28-га году ў Беларусі было ўсяго 507 калгасаў, якія аб'ядналі 8.490 двароў.

Зараз налічваецца ўжо больш 4.000 калгасаў, якія аб'ядноваюць 113.000 бядняцка-серадняцкіх двароў, г. зн. каля 15 проц. усяго сялянскага насельніцтва рэспублікі.

Калгасы ў 1930 годзе з посьпехам выканалі веснавую, уборачную і асеньнюю кампаніі, дабіліся вялікіх перамог.

Ураджайнасьць у калгасах павялічана на 20 проц. у параўнаньні з ураджайнасьцю індывідуальных гаспадарак. **Кожны калгасны трактар апрацаваў да 400 гэкт. зямлі.** Даход калгасьніка ўсюды перавышае даход адзінаасобніка. Тэмпы калектывізацыі растуць.

У адказ інтэрвэнтам, контр-рэвалюцыянэрам — беларускім нац.-дэмакратам, перамагаючы шалёнае супраціўленьне кулацтва, адзін за другім растуць новыя калгасы.

Калгасы Беларусі ўзялі рашучы курс на спэцыялізацыю ў бок разьвіцьця жывёлагадоўлі і тэхнічных культур. Мы ўжо дабіліся буйнейшых посьпехаў у галіне разьвіцьця жывёлагадоўлі.

У спэцыялізаваных калгасах пастаўлена **38.000 кароў, 37.000 сьвінаматак.** Калгасы набылі шмат маладняку і буйной рагатай жывёлы. У большасьці раёнаў, **на кожныя 100 кароў у калгасах прыпадае 90 штук маладняка.** Нагул, камплектаваньне маладняка выкананa больш, чым на 100 проц.

Створана моцная база для далейшага пасьпяховага вырашэньня мясной праблемы. **У будучым годзе мы павінны давесьці стада сьвінаматак да 150.000 і адкарміць для рабочага забесьпячэньня 210.000 сьвіней.** Жывёлагадоўчыя калгасы напіраюць свае стада да 400 тыс. галоў і дадуць па менш 40.000 тон малочных прадуктаў для рабочага забесьпячэньня.

Перад намі стаіць задача забясьпечыць кармамі стада, ліквідаваць прарывы ў будаўніцтве абораў і сьвінарнікаў.

Ажыцьцяўленьне паменаных партыяй мерапрыемстваў да веснавой сяўбы ў калгасах забясьпечыць нам рашучыя арухі ў разьвіцьці жывёлагадоўлі і тэхнічных культур. У гэтую вясну больш аднэй трэці насеўнай плошчы будзе ахопленa калгасамі і саўгасамі. Мы пасеялі ў калгасах засеяць 86.000 гэкт. ільну і канапель, 217.000 гэкт. бульбы. На нашых палёх будуць працаваць 1.500 трактараў.

Такавы нашы дасягненьні і нашы пляны на 1931 год.

Мы ўпэўнены ў іх рэальнасьці і магчымасьці ня толькі іх выканаўньня, але і перавыкананьня. Зарукай посьпеху зьяўляецца правільнае кіраўніцтва камуністычнай партыі і дапамога пралетарыяту ўсяго Савецкага Саюзу. Усямерна разгортваючы сацыябаборніцтва і ўдарніцтва, пашыраючы масавую работу сярод адзінаасобнікаў, пераконваючы іх паказам і сапраўдная бальшавіцкай падрыхтоўкай да вясны лепшых калгасаў, мы даб'ёмся выканаўньня пляну ў 1931 годзе, сцэцальная калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як клясы да канца пяцігодкі.

Прыведзеныя намі вялізарныя дасягненьні ў сацыялістычнай рэканструкцыі беларускай вёскі зьяўляюцца яркімі паказальнікамі правільнай генэральнай лініі партыі, наносяць руйнуючы ўдар па апартуністах усіх колераў.

Гэтыя дасягненьні б'юць па контр-рэвалюцыянэрах, нацыянал-дэмакратах-прышчэпаўцах, гэтых агентах кулацкай кандрацьеўшчыны. Калгасны рух і яго посьпехі растуць наперакор шкодніцкай палітыцы і практыцы гэтых клясавых ворагаў працоўных Беларусі.

Мы добра разумеем, што атрыманыя намі перамогі дасягнуты дзякуючы вялізарнай дапамозе, якую аказваюць Савецкай Беларусі — савецкія рэспублікі, што ўваходзяць у СССР.

Мы добра яшчэ памятаем акупацыю БССР белапалякамі, якія зруйнавалі масы беларускага сялянства і сельскую гаспадарку краіны. Той-жа малюнак мы маем зараз у Зах. Беларусі, якая стогне пад ботам Пілсудскага.

Мы да апошняй кроплі крыві будзем змагацца за сацыялістычную Савецкую Беларусь, зьнішчаючы ў корані ўсялякія спробы контр-рэвалюцыянэраў беларускіх нацыянал-дэмакратаў адарваць БССР ад Савецкага Саюзу, каб зрабіць яе калёніяй фашысцкай Польшчы.

Калі патрэбна будзе, мы ўсе як адзін, са зброяй у руках, станем на абарону Савецкай Беларусі — гэтага фарпосту Савецкага Саюзу на капіталістычным Захадзе.

Дэлегацыя калгасьнікаў БССР.

„Аб чым я раскажу ў Маскве“

ЕСЬЦЬ АБ ЧЫМ РАСКАЗАЦЬ ПРАЛЕТАРАМ САВЕЦКАГА САЮЗУ. МЫ ПРЫ ДАПАМОЗЕ КВАЛІФІКАВАНЫХ РАБОЧЫХ МАСКВЫ І ЛЕНІНГРАДУ ПАБУДАВАЛІ МАГУТНУЮ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЮ — 1-ШУЮ БЕЛДРЭС. НІ АДЗІН ЧАЛАВЕК НЯ МОГ ПАВЕРЫЦЬ ТАМУ, ШТО Ў НЕТРАХ НЕПРАХОДНЫХ БАЛОТ ВЫРАСЬЦЕ ГОНАР БЕЛАРУСКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ МАГУТНАЯ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ, ЗАРАЗ НЯМА БАЛОТ, ЕСЬЦЬ ШАША, ДЗЕ ХОДЗЯЦЬ АЎТАБУСЫ І АЎТАМАБІЛІ. НА АСІНВУДЗЕ ПРАЦУЕ КАЛЯ 600 РАБОЧЫХ, БОЛЬШАСЬЦЬ З ІХ ВЯСКОВЫЯ. УВЕСЬ НАШ КАЛЕКТЫЎ ЗРАЗУМЕЎ ЗАДАЧЫ ПАРТЫІ І ТАМУ МЫ ПУСЬЦІЛІ СТАНЦЫЮ Ў ТЭРМІН.

НАШ КАЛЕКТЫЎ БУДУЕ НОВАЕ ЖЫЦЬЦЕ. УСЕ РАБОЧЫЯ ЖЫВУЦЬ У НОВЫХ КВАТЭРАХ, У ЯКІХ—СПЭЦЫЯЛЬНЫЯ ВАННЫЯ ПАКОІ, ЭЛЕКТРЫЧНАЕ АСЬВЯТЛЕНЬНЕ ПАРААЦЯПЛЕНЬНЕ І Г. Д. АБ ГЭТЫМ НАШЫ РАБОЧЫЯ Ў СТАРЫЯ ЧАСЫ І ДУМАЦЬ НЕ МАГЛІ.

МЫ БУДУЕМ КУЛЬТУРНЫЯ ЎСТАНОВЫ. АДНА ШКОЛА — У АРЭХАХ, ПОТЫМ СЯМІГОДКА. У ГЭТЫХ ШКОЛАХ ВУЧАЦЦА ДЗЕЦІ РАБОЧЫХ І ДЗЕЦІ БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ НАЎКОЛЬНЫХ ВЁСАК.

У СТАРЫЯ ЧАСЫ Я САМ ПРАЦАВАЎ НА МАСКОЎСКІХ ЗАВОДАХ І МАЙСТРЫ З МЯНЕ ЗАЎСЕДЫ СЬМЯЯЛІСЯ. СЬМЯЯЛІСЯ ТАМУ, ШТО Я НЯ МОГ ПА-РАСІЙСКУ ДОБРА ГАВАРЫЦЬ. А ЗАРАЗ РАБОЧЫ МАСКВЫ РАЗУМЕЕ РАБОЧАГА-БЕЛАРУСА І АДЗІН ДРУГОМУ ДАПАМАГАЕ Ў САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ.

ІНЖЫНЭРЫ СІЎРУК І КАТУЛЬСКІ ПРАЗ КУРСЫ ПАДРЫХТАВАЛІ 120 ЧАЛ., ЯКІЯ ЎЖО ПРАЦУЮЦЬ НА КВАЛІФІКАВАНАЙ РАБОЦЕ. ЗАРАЗ АРГАНІЗАЦЫІ АСІН БУДУ СТВАРАЮЦЬ НОВЫЯ КУРСЫ, ПРАЗ ЯКІЯ ДУМАЮЦЬ ПРАЦУСЬЦІЦЬ УВЕСЬ ШТАТ РАБОЧЫХ.

РАБОЧЫЯ АСІНВУДУ ПЕРАМАГЛІ УСЕ ТРУДНАСЬЦІ, ЯКІЯ СТАЯЛІ НА ШЛЯХУ ПАБУДОВЫ. МЫ ПЕРАМОЖАМ І З КОРАНЕМ ВЫКАРЧУЕМ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ ЛЕКАЯЎ — НАЦЫЯНАЛ-ДЭМАКРАТАЎ І ШКОДНІКАЎ, ЯКІЯ РЫХТУЮЦЬ ВЯРОЎКУ ДЛЯ ЗАДУШЭНЬНЯ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ.

У НАС НЯМА РАБОЧАГА, ЯКІ-Б НЕ ЗЬЯЎЛЯЎСЯ ЎДАРНІКАМ, І НАШЫ ЎДАРНІКІ АДКАЗАЛІ ШКОДНІКАМ УЗМАЦНЕНЬНЕМ ПРАЦДЫСЦЫПЛІНЫ І ПАДПІСКАЙ НА ПАЗЫКУ Ў РАЗЬМЕРЫ 100 ПРОЦ. МЕСЯЧНАЙ ПЭНСІІ.

НЯМА ТАКОЙ СІЛЫ Ў СЬВЕЦЕ, ЯКАЯ-Б МАГЛА ЗЛАМАЦЬ ЖАЛІЗНУЮ ВОЛЮ РАБОЧЫХ БУДАВАЦЬ САЦЫЯЛІЗМ У НАШАЙ КРАІНЕ.—

ВОСЬ АБ ЧЫМ Я РАСКАЖУ Ў МАСКВЕ.

УДЗЕЛЬНІК ДЭЛЕГАЦЫІ БССР — С. ВАКОР, ТОКАР, ВЫТВОРЧЫ СТАЖ 20 ГОД.

Ленінская нацыянальная палітыка

забясьпечыла рост культурнага ўзроўню яўрэйскіх працоўных мас

Пасьлядоўнае правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі прывяло да хуткага гаспадарчага і культурна-палітычнага ўздыму соцень адсталых, раней прыгнечаных царска-капіталістычным ярмам, нацыянальнасьцяй.

Савецкая Беларусь, адна з былых акраінных акраін царскай Расіі, за гады пасьля Вялікага Кастрычніка, дасягнула, пад кіраўніцтвам партыі і пры брацкай дапамозе пралетарыяту ўсяго Саюзу, вялізарнейшых дасягненьняў у галіне гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Аб гэтым сьведчыць вялікі рост прамысловасьці, сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі, рост культурна-бытавых устаноў, пачынаючы з нізэйшай школы і канчаючы тэхнікумамі, рабфакамі і вышэйшымі навучальнымі установамі.

У БССР, раней, чым ва ўсіх рэспубліках, было ўведзена ўсеагульнае абавязковае навучаньне. Разам з гэтым расьце з кожным годам матар'яльны дабрабыт і палітычная актыўнасьць рабочае клясы і працоўных краіны.

На фоне пасьпяховага ажыцьцяўленьня задач сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР ёсьць значныя дасягненьні ў галіне гаспадарчага і культурнага будаўніцтва сярод усіх нацыянальных меншасьцяй, якія насяляюць рэспубліку, і ў прыватнасьці ў гаспадарчым упарадкаваньні і культурна-масавым абслугоўваньні рабочых і працоўных яўрэйскага насельніцтва, удзельная вага якога ў краіне даволі значная — 8,2 проц. да ўсяго складу насельніцтва (паводле перапісу 1926 г., 407.059 чал.).

Дзякуючы мерапрыемствам, праведзеным партыяй і ўрадам, за гады пасьля рэвалюцыі значна зьмяніўся сацыяльны твар яўрэйскага насельніцтва — вырас пік рабочых, занятых у буйной прамысловасьці (12.000 рабочых); тысячы сем'яў уцягнуты ў сельскую гаспадарку. У сучасны момант налічваецца 10 тыс. сем'яў, занятых сельскай гаспадаркай, у тым ліку 3.920 сем'яў у калгасах.

З году ў год расьце сетка культурных устаноў на яўрэйскай мове, як па лініі масавай школы, так і па лініі палітасьветустаноў і прафтэхнічнай асьветы.

Да 1929-30 г. мы маем па тэрыторыі БССР 174 школы 4-годкі і 81 7-годку (у тым ліку 3 дасяцігодкі). За два гады з 1928 па 1930 г. сетка 4-годак узрасла на 18 проц., а сетка сямігодак — на 30 проц. Агульны лік вучняў у 1930-31 навучальным годзе ў яўрэйскіх школах складае **32.000, ці 60% усіх яўрэйскіх дзяцей, якія вучацца ў школах.** У 1927 годзе гэты процант складаў 52. Паводле вестак 70 раёнаў, у 1930-31 навучальным годзе адкрылася 26 новых камплектаў 1-га канцэнтру і 11 груп 2-га канцэнтру. Такім чынам, амаль ва ўсіх населеных мясцох ёсьць школы. За апошнія гады пашырылася будаўніцтва школьных памяшканьняў і забесьпячэньне школ абсталяваньнем і вучэбнымі прыладамі. У мястэчках школы ўсё больш і больш становяцца цэнтрам правядзеньня культмасавай і выхаваўчай работы сярод яўрэйскіх працоўных.

Але пры ўсім гэтым трэба адзначыць недахопы, якія мы маем у галіне школьнага і дашкольнага будаўніцтва: адсутнасьць да гэтага часу дэталёва распрацаванага пляну разьвіцьця сеткі масавай школы і дашкольнага выхаваньня, няпоўны ахоп дзяцей школай на роднай мове (паводле перапісу 1926 году ў 89,5 проц. яўрэйскага насельніцтва родная мова — яўрэйская). Зусім невыстарчальна разгорнута сетка дашкольных устаноў на яўрэйскай мове, у асабліваснці на лініі грамадзкіх арэ, у асабліваснці на лініі грамадзкіх арэ, у асабліваснці на лініі грамадзкіх арэ. Адчуваецца вострый недахват у педагагічных кадрах.

У галіне прафтэхнічнай асьветы адбыўся рашучы зрух толькі за апошнія два гады. Старое праваапартуністычнае кіраўніцтва Наркамасьветы ў асобе Бакіраўніцтва Наркамасьветы ў асобе Бакіраўніцтва Наркамасьветы ў асобе Ба- цалкам масавую школу падручнікамі, вымяніць больш хуткім тэмпам устараелыя і нявытрыманыя падручнікі. Спабавата яшчэ выдаецца масавая літаратура.

Па лініі мастацтва мы маем на Беларусі наступныя інстытуты:

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр, які па сваім рэпэртуары, як у ідэалёгічных адносінах, так і ў мастацкім афармленьні займае выдатнае месца ў пралетарскім мастацтве; перасоваўны тэатр, дзяржаўная хор-студыя і за апошні час арганізаваўся «ТРАМ».

Мерапрыемствы па ўцягненьні яўрэйскіх рабочых і працоўных у актыўнае сацыялістычнае будаўніцтва, ударная работа КП(б)Б па бальшавізацыі яўрэйскіх рабочых мас і разгорнутая барацьба з ухіламі і скажэньнямі на ідэалёгічным фронце (вялікадзяржаўным шавінізмам, нацыянал-дэмакратызмам, антысэмітызмам і яўрэйскім шавінізмам), — далі магчымасьць з посьпехам выкарчоўваць рэшткі нацыяналістычных і дробна-буржуазных ідэалёгій (бунд, сіанізм і інш.) і ўплыў клерыкальных і рэлігійных элемэнтаў на яўрэйскія працоўныя масы, узмацніла інтэрнацыянальную салідарнасьць яўрэйскіх працоўных і інш. нацыянальнасьцяй, якія насяляюць БССР.

Аднак, трэба з усёй вострасьцю адзначыць, што клясавы вораг яшчэ канчаткова ня выбіт са сваіх пазыцый на ідэалёгічным фронце. Аб гэтым выразна гавораць выкрытыя партыяй скажэньні клясавай лініі і варожыя нам тэндэнцыі ў культурнай рабоце, у прыватнасьці па лініі пэдкова-дасьледчай работы.

Яшчэ да параўнальна кладуўняга часу праграмы гісторыі і грамадазнаўчых дысцыплін на яўрэйскай сэкцыі пэдфаку былі прасякнуты антымарксыцкімі і нацыяналістычнымі ўстаноўкамі. 45 проц. вучэбных гадзін яўрэйскіх дысцыплін займала старажытная яўрэйская мова. У зборніку «Шрыфты» былі надрукаваны артыкулы яўна нацыяналістычнага і клерыкальнага характару.

Да апошняга часу навуковыя працы яўрэйскага сэктару ВАН (зараз узмоцнена кіраўніцтва і склад ВАН) былі прасякнуты духам ідэшызму і ня былі накіраваны на службу сацыялістычнага будаўніцтва.

Былі спробы працягнуць у падручнікі нацыяналістычныя і контр-рэвалюцыйныя ідэі. Ідэалізацыя яўрэйскай мовы, як самамэта, і дакладная ахова яе ад «засьмечанасьці чужароднымі словамі» ўзмоцнена прапаведвалася і праводзілася шавіністычнымі элемэнтамі.

Трэба таксама адзначыць, як на адну з праяў вялікадзяржаўнага шавінізму, посьбітамі якога зьяўляюцца пасобныя культработнікі, адмоўныя адносіны да беларусізацыі, што выяўляюцца як у актыўнай, так і ў пасыўнай форме.

Мабілізацыя яўрэйскіх рабочых, працоўных і пралетарскай інтэлігенцыі на выкананьне задач, пастаўленых партыяй у галіне сацыялістычнага будаўніцтва і культурнай рэвалюцыі, патрабуе далейшага паглыбленьня ўсёй культурна-масавай работы на роднай мове, правядзеньня выразнай клясавай лініі ва ўсёй культурнай рабоце.

Неабходна мабілізаваць увагу ўсіх зьвеньняў культустаноў — школы, клюбы, пардамы, бібліятэкі — на падпраддаваньне ўсёй сваёй работы задачам сацыялістычнага будаўніцтва, выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, правядзеньне суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на гэтай базе кулацтва, як клясы.

Палітэхнізацыя школы, паглыбленьне інтэрнацыянальнага і антырэлігійнага выхаваньня мас і падрастаючага пакаленьня, рашучая барацьба супроць клясава-варожых і шавіністычных элемэнтаў, барацьба супроць правых і «левых» ухілаў у культурным будаўніцтве — вось тыя стрыжнёвыя пытаньні, вакол якіх трэба будаваць усю нашу культработу.

Чорнабродаў Я. Н.

Зборка маторных частак трактараў уцэнтральнай майстэрні Белсельтрэсту.

У АТАКУ ЗА ЛЁН

Ударыць па апартуністычнай стаўцы на самацёк

Калгасы павінны быць упарадзе

Рад калгасаў дагэтуль яшчэ не зразумелі важнасьці своечасовай здачы дзяржаве ільнавалакна і не арганізавалі як належыць апрацоўку ільну.

Райкалгасаюзы раду раёнаў у гэтай важнейшай справе спадзяваліся на самацёк, плятуцца ў хвасьце найбольш адсталай часткі калгасьнікаў і на прымаюць ніякіх мер па мабілізацыі калгаснай грамадзкасьці і ўсіх калгасьнікаў па рэалізацыі дырэктыў партыі і ўраду аб ільназагатоўках, чым садзейнічаюць кулацкай агітацыі за срыў ільназагатовак.

Райкаапсаюзы і спажыўтаварыствы таксама ня праяўляюць выстарчальнай актыўнасьці ў справе дапамогі калгасам у арганізацыі апрацоўкі ільну і не вядуць дакладнага ўліку прадукцыі, якая здаецца калгасамі.

На такіх правах апартуністычнай практыкі ў рабоце паасобных райкалгасаюзаў і загатоўчых арганізацый трэба ўдарыць самым рашучым чынам.

Праўленьне Белкалгасцэнтру накіравіла праўленьні райкалгасаюзаў аб тым, што яны ў першую чаргу нясуць поўную адказнасьць за выкананьне пляну здачы калгасамі ільну і ніякі загатоўчым органам.

Белкалгасцэнтр абавязаў праўленьні райкалгасаюзаў безадкладна праверыць выкананьне калгасамі раней даданых дырэктыў аб арганізацыі апрацоўкі ільну і здачы яго каапэрацыйным загатоўшчыкам.

Райкалгасаюзам і калгасам прапанавана выкарыстаць вопыт лепшых калгасаў, якія амаль поўнасьцю выканалі ўжо план здачы ільну, дзякуючы разгортванню сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж паасобнымі брыгадамі, а таксама ўстанаўленьню цьвёрдых норм выпрацоўкі (арматыровачна 6 клтр. за 8 гадзін работы ў дзень і выдача мануфактуры, што адпускаецца для прэміяваньня ільназдатчыкаў, у першую чаргу тым калгасьнікам і калгасьнікам, якія заняты на апрацоўцы ільну).

Ганебна адстаюць

Наступныя раёны БССР ганебна адстаюць у выкананьні пляну загатовак ільну і пянькі. ВЕТРЫНСКІ раён выканаў гадавы план па ільназагатоўках на 0,7 проц., ГЛУСКІ — 2,1 проц., КОПЫЛЬСКІ — 2,6 проц., ЖЛОБІНСКІ — 1,9 проц., ЛЕЛЬЧЫЦКІ — 1,9 проц., ЧЭРЫКАЎСКІ — 2,1 проц.

Загатоўка пянькі не разгорнута амаль ні ў адным раёне. Так, БАБРУЙСКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ЗАДАНЬНЕ ПА ПЯНЬЦЫ НА 1 ПРОЦ., ГЛУСКІ — НА 0,2 ПРОЦ., ЛЯДНЯНСКІ — НА 1,5 ПРОЦ., КАПАТКЕВІЦКІ — 1 ПРОЦ., ЛЕЛЬЧЫЦКІ — 0,4 ПРОЦ. Зусім на прыступілі да загатовак пянькі СЛУЦКІ, ТУРАЎСКІ І ЧАРЭЙСКІ РАЁНЫ.

Па тэмпу ільназагатовак НАПЕРАДЗЕ ІДУЦЬ ДРЫСЕНСКІ РАЁН, ЯКІ ВЫКАНАЎ ЗАДАНЬНЕ НА 52 ПРОЦ., БРАГІНСКІ — НА 37,3 ПРОЦ., КРУГЛЯНСКІ РАЁН — НА 34,3 ПРОЦ. І ВУЗЬДЗЕНСКІ РАЁН—НА 35,4 ПРОЦ.

Тысяча коп неапрацаванага ільну

ПАРЫЧЫ. (Наш кар.). Па Парычскім раёне план ільназагатовак выкананы усяго на 8-10 проц. У калгасах Сьцепскага сельсавету да 800-1000 коп. ільну дагэтуль не апрацаваны. Частка яго ужо пасьпявалася. Кіраўнікі паасобных калгасаў, а таксама і раённыя загатоўчыя арганізацыі ня прымаюць ніякіх мер да ўзмацненьня тэмпу апрацоўкі ільну.

Л. К.

Кулак не адчувае націску

Вушацкі раён павінен загатовіць 250 тон ільнавалакна. На 25-га сьнежня загатоўлена ўсяго 14 тон.

Некаторыя загатоўчыя арганізацыі і сельсаветы прымірэнча адносяцца да кулака. У радзе сельсаветаў цьвёрдыя зданьні яшчэ ня даведзены да кулака - заможных гаспадарак. Ня прынятыя ўсе патрэбныя меры, каб прымусіць кулака выканаць цьвёрдае заданьне.

Апрацоўка ільну ў калгасах, а таксама і ў адзінаасобным сэктары не разгорнута.

Некаторыя загатоўчыя арганізацыі разасланы пляны і на гэтым супакоіліся.

Здаць закантрактаваны лён

У ПААСОБНЫХ РАЁНАХ—КОЙДАНАЎСКІМ, ЖЛОБІНСКІМ НЕКАТОРЫЯ КАЛГАСЫ НЕ ЗДАЮЦЬ ЗАГАТОЎШЧЫКАМ ІЛЬНУ І ІЛЬНАСЕМЯ, ВЫЗНАЧАНЫЯ ПА ПЛЯНЕ.

БЕЛКАЛГАСЦЭНТР ПРАПАНАВАЎ УСІМ РАЙКАЛГАССАЮЗАМ БЕЗАДКЛАДНА ПРЫНЯЦЬ МЕРЫ ДА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ ТЭМПУ ІЛЬНАЗАГАТОВАК І ПРАВЕРКІ ХОДУ ЗДАЧЫ ІЛЬНУ ЗАГАТОЎШЧЫКАМ.

ПРАЎЛЕНЬНІ КАЛГАСАЎ, ЯКІЯ НЯ ВЫКАНАЮЦЬ СВАІХ АБАВЯЗКАЎ ПА ЗДАЧЫ ЗАКАНТРАКТАВАНАГА ІЛЬНУ, БУДУЦЬ ПРЫЦЯГНУТЫ ДА АДКАЗНАСЬЦІ.

Па Савецкай Беларусі

49 панчошных машын

СТАЯЦЬ БЯЗ РУХУ

5.000 пар панчох не дадаецца штодзенна дзяржаве

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Панчошная фабрыка імя Клары Цэткін з 21 па 26 сьнежня выканала праграму на 92,89 проц. Праверачныя брыгады выявілі рад недахопаў, якія перашкаджаюць выкананьню вытворчай праграмы.

Фабрыка атрымала ад Тэкстыльтрэсту 55 новых машын, з якіх пушчана ў ход толькі 6, але і гэтыя працуюць з перабоямі. Рэшта машын стаяць бяз руху.

Многія часткі ад гэтых машын яшчэ ня прысланы, некаторыя часткі не адпавядаюць стандарту, нядобракасныя. Адміністрацыя фабрыкі прымала машыны без папярэдняй праверкі.

Штодзенна, з прычыны прастою машын, фабрыка недадае дзяржаве 5.000 пар панчох.

У швейна-выравальным і малярна-апатурным цэхах выяўлен запас поўфабрыкатаў і няскончанай прадукцыі на 230 тыс. руб. На складзе выяўлена на 24 тыс. руб. гатовай прадукцыі—41.000 пар панчох.

Брыгады па аглядзе праверылі работу вытворчых нарад.

Вытворчыя нарады зусім ня цікавіліся пытаньнем лепшага скарыстаньня сырцу, апалу і абсталяваньня. Партыйцы і камсамольцы прымаюць вельмі слабы ўдзел у рабоце вытворчых нарад.

Адміністрацыйна-тэхнічны персанал таксама амаль зусім не наведвае пасяджэньняў вытворчых нарад.

Лепшая справа в рабочымі ўзнагародамі. За апошнія два з паловай месяцы з 179 прапаноў, якія ўнесены рабочымі, 143 праведзены ў жыцьцё, рэшта знаходзіцца ў стадыі выкананьня. Адміністрацыя ня ўлічвае эфэктыўнасьці рабочых прапаноў.

За час генэральнага агляду ва ўдарныя брыгады ўступіла 376 новых рабочых. 117 рабочых за гэты час самазамацаваліся на фабрыцы да канца пяцігодкі. 15 лепшых ударнікаў падалі заявы аб уступленьні ў партыю.

У сувязі з перавыбарамі гарсаветаў рабочымі падана 260 прапаноў. 12 лепшых ударнікаў фабрыкі выбраны ў гарадзкі савет.

Ар. 3—ны.

КУДЫ ЗНІКЛІ АБЛІГАЦЫІ МАГІЛЕЎСКІХ ЧЫГУНАЧНІКАЎ?

Да адказнасьці—за злачынна-бюракратычныя адносіны да дзяржкрэдыту

Памочнік машыніста ст. Магілеў т. Блізьняцоў прыехаў у Менск, прыехаў шукаць... аблігацый 3-й пазыкі індустрыялізацыі, якія належаць рабочым службы цягі ст. Магілеў.

Тав. Блізьняцоў прышоў у рэдакцыю, каб паведаміць абураючую гісторыю з аблігацыямі.

Ён выйграў 100 руб. па апошнім тыражы пазыкі і ніяк ня можа атрымаць выйгрышу, бо пенядома куды зьніклі аблігацыі, якія знаходзіліся на хаваньні ў канторы дэпо ст. Магілеў. Пасьля рэарганізацыі Магілеўскага вучастку чыгункі, аблігацыі, як быццам, трапілі ў Аршанскую раённую кантору. Тав. Блізьняцоў, па даручэньні рабочых, паехаў у Оршу адшукаць аблігацыі. Там яму заявілі, што ў раённай канторы аблігацый няма, што, напэўна, яны знаходзяцца ў арцельшчыкаў.

Тав. Блізьняцоў запытаўся ў арцельшчыкаў — у іх аблігацый не аказалася. — Магчыма, — заявілі яны, — аблігацыі ляжаць у кіраўніцтве чыгункі ў Менску. І тут яны ня знойдзены.

Мы лічым гэтакія адносіны да справы дзяржкрэдыту злачыннымі. Органы пракуратуры павінны зараз-жа запяцца гэтай справай і прыцягнуць вінаватых да судовай адказнасьці.

Аблігацыі 3-яй пазыкі індустрыялізацыі, якія загінулі ў бюракратычных нетрах чыгункі, павінны быць ва што-б там ні стала знойдзены.

Паведамленьні

— Нарада пры ЦК КП(б)Б загадчыкаў аддзелаў агітацыі і мас. кампаній райкомаў КП(б)Б, скліканая раней на 7-XII—30 г. і адкладзеная, назначаецца на 14 студзеня 1931 г. Парадак дня: 1) Чарговыя задачы агітацыйнай работы партыі. 2) Задачы агітацыйна-масавай работы на прадпрыемствах у 3-м годзе пяцігодкі. 3) Рэтартаваньне калектыўзацыі і задачы агіт.-масавай работы на вёсцы. 4) Бягучыя кампаніі і работа добраахвотных таварыстваў. На нараду выклікаюцца загадчыкі агітмасавых аддзелаў наступных райкомаў і гаркомаў: Барысаўскага, Менскага, Віцебскага, Гомельскага, Аршанскага, Магілеўскага, Полацкага, Мазырскага, Бабруйскага, Асьвейскага, Койданаўскага, Пятрыкоўскага, Чырвонаслабодскага, Быхаўскага, Клімавіцкага, Чачэрскага, Гарадоцкага, Рагачоўскага, Капыльскага, Семяхвалавіцкага, Слуцкага, Жлобінскага, Горацкага, Коханаўскага, Шклоўскага, Чэрвеньскага, Сеньненскага, Чашніцкага і агітмасавых работнікі партколектываў: запалкавай ф-кі (Гомель) і станцыйнага чыгуначнага вузла — Жлобін.

— Менская гарадзкая кантрольная камісія КП(б)Б (Менск, вул. Энгельса, 28, 2-гі паверх), 5-1—31 г., у 6 з пал гада, веч. будзе разглядаць справы наступных т. т.: Песьнякевіча — яч. МРВ, Сіняўскага — МББ, Назарчука, Тамашэўскага, Рудэрмана — аар. «Бальшавік», Гурвіча — БКС, Меламеда — МЦРК, Пэўзнера — «Энэргія», Мурашка, Шчуцкага і Самісевіча — рэфак. Бучкоўскага, Ламаня, Шыманоўскага, Ананіча — МББ, Фальдмана і Вэксэльра — Дзяржбанк, Балсуна — Камвуз, Карасіка М. Б., Казлова А. Р. — шкозавод, Шкора М. І., Такарова Л. А. — рабфак, Драздова І. С. Памянёныя т.т. запрашаюцца для прыняцьця ўдзелу пры разглядзе іх справ. Таксама павінны зьявіцца сакратары ячэек, дзе яны лічацца на вучоце і якія знаходзяцца ў Менску.

СЕНЬНЯ:

— КУБ. У 19 гада., у пак. 22 КУБ —арганізацыйны сход т. т., якія падалі заявы на вячэрняе гаэтэнае аддзяленьне КУБ'у. Яўка абавязкова.

— БАН. У 19 гада. — агульны адкрыты сход яч. ЛКСМБ БАН. Яўка камсамольцаў-асьпірантаў. БАН, друк. БАН, БДУ і Камвузу абавязкова.

— Дом Санасьветы. У 19 гада. — экскурсія членаў секцыі аховы адароўя гарсавету ў Дом Санітарнае Асьветы.

ЗАЎТРА:

— Дом Камасьветы. У 19 гада. — даклад для парт. і камсам. актыву «Аб выніках сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б)». Білеты ў гаркоме і чыт. Дому.

— ЦСПСБ. У 19 г. у залі пасяджэньняў ЦСПСБ культсэктар ЦСПСБ склікае нараду ўсіх культарганізатараў. ФЗМК, МК і ГК. заг. клюбаў, па пытаньні аб рабоце сярод нацменшасьцей у клюбе і на прадпрыемствах. Старшыням ФЗМК прасачыць за яўкай.

Дам Асьветы. У 19 гада. — агульны сход членаў ЖВКТ «Асьветнік-Камунар». Парадак дня: 1) Інфармацыя праўленьня аб праробленай працы. 2) Праект дому. 3) Аб выбарах у гарсавет. 4) Бягучыя справы. Просьба зьявіцца своечасова.

Выкананьне пляну мясазагатовак—пад пагрозай

Гадавое заданьне выканана толькі на 12,4 проц.

УДАРЫЦЬ ПА КУЛАЦТВЕ І ЯГО АГЕНТАХ—АПАРТУНІСТАХ, ЯКІЯ ЗРЫВАЮЦЬ ЗАГАТОЎКІ

Апошні пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б адзначыў неабходнасьць самай рашучай барацьбы з апартуністамі у практыцы мясазагатовак, які зьяўляецца адным з найбольш моцных тормазаў, што перашкаджаюць пасьпяховаму разгортваньню загатоўчай работы.

Ход загатовак мяса па БССР на сёньняшні дзень вельмі незадавальняючы. За другую дэкаду сьнежня, паводле даных 27 кантор Белмяса, месячнае заданьне выканана ўсяго толькі на 17,3%. Плян загатовак асобнага кварталу выканан на 51,2 проц., гадавое заданьне —на 12,4 проц.

Да 1-га красавіка план мясазагатовак павінен быць выкананы ня менш, чым на 10 проц. Тэмпы загатовак у БССР не забясьпечваюць своечасовага выкананьня пляну і ставяць пад пагрозу паляпшэньне рабочага забесьпячэньня.

Да гэтага часу цьвёрдыя заданьні па мясазагатоўках у радзе раёнаў не даведзены да кулацкіх двароў, што дае магчымасьць кулаку беспакарана, па-дранежніцку зьнішчаць жывёлу.

У радзе месц пытаньням узмацненьня мясазагатовак не аддаецца належнай увагі. Адсутнічае кантроль за давядзеньнем пляну да кулацка - заможнага двара і за выкананьнем іх. У радзе раёнаў пляны не даведзены нават да сельсавету (Самахвалавіцкі, Парыцкі і г. д.).

Загатоўчыя арганізацыі бязьдзейнічаюць і не пераключыліся на новыя мэтады работы. Загатоўкі ідуць самацёкам. Адсутнічае масавая работа сярод працоўных колаў сялянства па выкананьні мясазагатоўчых пляноў. Грамадкасьць ня прыцягнута да ўзмацненьня мясазагатовак.

Палобным зьявішчам у практыцы мясазагатовак трэба абвясьціць самую рашучую барацьбу, ударыць па апартуністах, альмаць кулацкія спробы перашкодзіць пасьпяховаму выкананьню мясагатовак.

Да гэтага часу яшчэ ня ўсюды зьнішчан амыляж, вядзецца канкурэнцыя паміж загатоўшчыкамі. Паводле дырэктыў ураду, в 1-га сьнежня ў кожнага раёне застаецца толькі адзін загатоўшчык, які вядзе ўсю работу. Гэта важнейшая дырэктыва ў жыцьцё не праведзена. Так, у Церахаўскім раёне вёска падзяляецца паміж паасобнымі загатоўшчыкамі.

Трэба рашуча перабудаваць работу ўсяго загатоўчага апарату, выгнаць з апарату бюракратычныя і апартуністычныя элементы.

Усё яшчэ слаба праводзіцца барацьба в патаемным забоем жывёлы. У выніку кулацкай агітацыі палялеціна ўзмоцнены патаемны забой жывёлы. Адміністрацыйныя органы чамусьці не вядуць, як належыць, барацьбу са школьніцкім забоем жывёлы.

Заданьне партыі павінна быць выканана. Пры актыўным удзеле калгасных і бяднянка - серадняцкіх мас вёскі, дакончы руйнуючы адпор клясаваму ворагу і яго агентам — правым і «левым» апартуністам, мы можам і павінны выканаць вызначаныя ўрадам пляны мясазагатовак.

А.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя газ. «ЗЬВЯЗДА» і прадстаўніцтва газ. «ПРАВДА» скліканоць на 4 студзеня ў 7 гадз. веч. у памяшканьні рэдакцыі газеты «Зьвязда» (Савецкая, 63, 3-ці паверх)

нараду рэдактароў, членаў рэдкалегій і рабкораў насьценгазэт, шматтыражак

прадпрыемстваў і ўстаноў г. Менску на пытаньні

АБ ПЕРАВЫБАРАХ МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА САВЕТУ.

У суботу, 3-га студзеня, у 6 гад. веч. у памяшканьні Дому Камасьветы імя Карла Маркса

адбудзецца

агульна-гарадзкая канфэрэнцыя

РАБКОРАК І ЧЫТАЧАК ЧАСОПІСІ „БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА“.

Парадак дня: 1) Даклад аб выніках пленуму ЦКК УсеКП(б), 2) Даклад аб працы рэдакцыі і падрыхтоўцы да Усесаюзнага зьезду рабселькораў.

Пасьля сходу—канцэрт.

Мандаты разасланы на прадпрыемствах і ўстановах. Т. т., якія не атрымалі мандатаў, могуць атрымаць іх у рэдакцыі 2 і 3 студзеня.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр

СЁНЬНЯ, 3 студзеня—АДКРЫТЫ СПЭКТАКЛЬ

У. Вішнеўскі.

„ПЕРШАЯ КОННАЯ“

прысьвечана Чырвонай арміі.

Пастаноўка У. Тэрэнцьева. Мастак Б. Матрунін. Музыка Сергіенка. Дэкарацыі. Фота для сьвятлых дэкарацый Ф. Ліхтэнштэйна. Гарыжэр І. Гітгарц. Хормайстар М. Кауфман. Пам. рэж. Я. Бунькоў.

ПАЧАТАК роўна у 8 гадз. веч.

Дзяржтэатр

Нядзеля, 4 студзеня

тэатры адзін канцэрт

— віртуозу —

юры БРУШКОЎ (піяніст)

САМУІЛ ФУРЭР (скрыпач).

Партыю ра яяю выканае Л. І. Файнштэйн.

Білеты прадаюцца ў касе тэатру з 12 да 2 г. і з 5 да 9 гада.

Пачатак у 8 пал. гада. веч.

АНОНС! Гэтымі днямі

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“

ВЯДОМЫЯ АРТЫСТЫ

ЭЗРИГАРДТ ГЕТЦКЕ,

МАГАРЫЛ, М. СІМАКІНА, Г. МІЧУРЫН, І. ЧУВЕЛЕЎ, А. КАСТРЫЧКІН, Д. ГУТМАН

У МАСТАЦКІМ ФІЛЬМЕ

ГАРАДЫ І ГАДЫ

Паводле аднайменнага раману К. Федэціна.

АНОНС!

Нявольнікі бледнай гары.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“

2-я І АПОШНЯЯ СЭРЫЯ знаменитай карціны

1. БЯЗБОЖНІЦА

2. Гукавы фільм у 2-х частках САРАКАВЫ МАЙ

Пачатак у 6 г., 7 гадз. 30 м., 9 гадз. 10 г. 30 м. веч.

Кіно-тэатр „Культура“

ШЧАСЬЛІВЫ КЕНТ

драма ў 6 частках.

Пачатак у 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м. КАСА—з 5 гадз.

КІНО „ПЕТЭРБУРГСКІ“

Гістарычны рамэн

ПАЗТА І ЦАР

Пачатак 1-го сэансу—6 гадз. 30 м. Каса—з 4 гадз. 30 м.

КІНО „Спартак“

БЕСТЭР КІТОН у лепш. замежным фільме

З ЭПОХІ З

Пачатак сэансу—6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м. і 1 каса—з 4 г. 30 м.

КІНО „Юны Піянэр“

Дзіцяе фільм ў адным сэанс.

Мастакі Аня Гай

Культур-фільм МАЛПА-ПАВІЯН

ПАЧАТАК: 1 гадз. дня, 2 г. 45 м. Каса—з 12 гадз. дня

КІНО „Спартак“

Усюды вядомы фільм

НАТЭЛА

драма ў 7 частках.

Пач. з—6 г. 30 м., 8 г. 30 м., 11 г. і каса—з 6 гадзіны

Да водама ўсіх ЦП, ГПС, РПС і ФЗМК

Конкурсная камісія пры ЦСПСБ

прапануе ўсім ЦК саюзаў, гарпрафсаветам, райпрафсаветам і ФЗМК не пазьней 8-га студзеня 1931 г. даслаць у камісію падрабязны матар'ял з лібовымі данымі аб усіх прадпрыемствах, якія ўключыліся ва Усесаюзны конкурс і конкурс на 3 сьцягі, і аб рабоце гэтых прадпрыемстваў у напрамку выкананьня ўмоў конкурсу, для канчатковага разгляду ў конкурснай камісіі ЦСПСБ пытаньняў аб прызначэньні прэміі і сьцягаў.

Пасьля 10 студзеня, у сувязі з ліквідацыяй конкурснай камісіі, ніякія матар'ялы аб прэміяваньні прадпрыемстваў разглядацца ня будуць.

Старшыня конкурснай камісіі пры ЦСПСБ КУЗЬНЕЦЦЭЙН.

АНОНС!

Нявольнікі бледнай гары.

Прымаецца падпіска на 1931 год

на навукова-дасьледчую, навукова-папулярную масавую краязнаўчую часопісь

„САВЕЦКАЯ КРАІНА“.

„Савецкая краіна“—навукова-дасьледчая, навукова-папулярная, марксыцка-ленінская краязнаўчая часопісь—зьмяшчае артыкулы навукова-дасьледчага, навукова-папулярнага, палітычна-масавага, публіцыстычнага, апісальнага характару, а таксама краязнаўчыя нарысы, марксыцка-ленінскую крытыку, рэцэнзіі і бібліяграфію.

„Савецкая краіна“—магутны барацьбіт за марксыцка-ленінскую ідэалёгію, за дыялектычны матэрыялізм Маркса-Энгельса-Леніна ў краязнаўстве і навуцы, магутны барацьбіт за генэральную лінію камуністычнай партыі.

„Савецкая краіна“—вялічны змагар з ваўрожымі марксызму-ленінізму плынямі ў краязнаўстве і навуцы, ставячы задачы вялічна змаганьня з контр-рэвалюцыйным шавіністычным, дэмакратызмам, за пралетарскую навуку і культуру, за савецкае краязнаўства.

„Савецкая краіна“ ставіць задачай набліжэньне вялікіх мас на дасягненьне навуковае дасьледаньне прадукцыйных сіл БССР у інтарэсах сацыялістычнага будаўніцтва і на непасрэдным ўдзеле у гэтым будаўніцтве.

„Савецкая краіна“—за савецкае краязнаўства.

„Савецкая краіна“—за перабудову ўсёй краязнаўчай працы на новых вытворчых асновах. Кожны завод, кожная фабрыка, кожны саўгас, калгас—дзень краязнаўчыя ячэйкі для вывучэньня прадукцыйных сіл у інтарэсах сацыялістычнага будаўніцтва.

„Савецкая краіна“—арыентуецца на масавага краязнаўцу. Партыйны і камсамольны, беспартыйныя рабочыя-калгасьнікі, батракі, бедната і лепшая частка серадняцкую, студэнцтва, вучнёўская моладзь, інтэлігэнцыя і гарадзкая інтэлігэнцыя, аддаюць справе сацыялістычнага будаўніцтва—актыўна пішуць у часопісь ваша краязнаўчыя доследы.

Часопісь „САВЕЦКАЯ КРАІНА“ выходзіць раз у месяц.

УМОВЫ ПАДПІСКІ: На год—4 р.; на 9 мес.—3 р. 25 к.; на паўгода—2 р. 25 к.; на 3 мес.—1 р. 25 к.; на 1 мес.—50 к.

Падпіска з вонкага асобна.

Падпіска прымаецца: у бюро падпіскі «Кнігапоштампа» (Менск, пляц Волі, 5), у рэдакцыі часопісі (Менск, пер. Ленінскай і Універсытэцкай, 29-35 Краязнаўства), на ўсіх паштовых аддзяленьнях, у раённых і акруговых краязнаўчых арганізацыях і ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва і інш.

ВЫДАВЕЦТВА „ТЭХНІКА УПРАВЛЕНИЯ“

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА НА 1931 Г.

„ЗАУЛУЧШЕНИЕ АППАРАТА“

Штомесячная часопісь Ін-ту Тэхнікі Кіраўніцтва пры НК-РСІ.

Адказны рэдактар М. І. Фукс.

Часопісь разьлічана на асноўную масу служачых і колы рабочых, што ўдзельнічаюць у паляпшэньні дзяржаўнага апарату.

ЧАСОПІСЬ МАЕ НАСТУПНЫЯ АДДЗЕЛЫ:

1) Удзел мас у кіраўніцтве і рацыяналізацыі, 2) Сацыялістычні арганізацыя працы, 3) Метадыка праверкі і паляпшэньня работы, 4) Практыка арганізацыі кіраўніцтва, 5) Практыка планаваньня і вучоту, 6) Тэхніка кіраўніцтва, 7) Інфармацыя па СССР і за мяжою, 8) Крытыка і бібліяграфія.

Падпісная плата на 1 год (12 №№)—4 р. 50 к.

Падпісная плата на паўгода (6 №№)—2 р. 50 к.

Асобны нумар—45 к.

„СТАНДАРТ“

Штомесячная часопісь Камітэту па стандартызацыі пры Савеце Працы і Абароны.

Часопісь прызначаецца для шырокіх пластоў рабочых, якія цікавяцца пытаньнямі стандартызацыі.

У ЧАСОПІСІ МАРКУЮЦЦА НАСТУПНЫЯ АДДЗЕЛЫ:

1) Тэхнічная палітыка сав. улады, 2) Што трэба стандартызаваць, 3) Гутаркі аб стандартызацыі, 4) Стандартызацыя за мяжой, 5) Сустрэчныя стандарты, 6) Барацьба за якасьць, 7) Хроніка стандартызацыі, 8) Бібліяграфія.

Падпісная плата за 1 год (12 №№)—3 р. 50 к., паўгода (6 №№)—1 р. 75 к. Падпісная плата за чэрвень году (3 №№)—90 к.—Асобны нумар—35 к. З прыклад. 100 стандартаў (толькі для галавных аддзелаў)—8 р. 50 к. на адзін з наступных разьдзелаў:

1) Перапрас. валігр дрэвазапрац., 2) Вымаральн. агульная электротэхніка, 3) Сукран. футравае, 4) Мэталюргія, 5) Нафтаперапрац. хімічн., 6) Харчовая сельсана-гасп., 7) Будаўніцтва, 8) Тэкстыль, 9) Транспарт.

„Организация управления“

Штомесячн. часоп. Ін-ту Тэхнікі Кіраўніцтва пры НК-РСІ.

Адказны рэдактар М. І. ФУКС.

Часопісь разьлічана на навукова-дасьледчых і практычных работнікаў у галіне савецкага будаўніцтва і рацыяналізацыі апарату, на кіруючы склад прафсаюзных работнікаў і на найбольш кваліфікаваных работнікаў дзяржаўнага апарату.

Часопісь мае наступныя аддзелы:

1) Тэорыя і мэтадалёгія кіраўніцтва, 2) Сыстэма кіраўніцтва, 3) Арганізацыя ўстановы і прадпрыемства, 4) Мэтодыка кіраўніцтва, 5) Плянаваньне вучоту, 6) Тэхніка кіраўніцтва, 7) Падрыхтоўка кадраў, 8) Арганізацыя і мэтодыка рацыянал. работы, 9) Інфармацыя і хроніка, 10) Крытыка і бібліяграфія.

Падпісная плата за 1 год (12 №№)—10 р. Падпісная плата за паўгода (6 №№)—5 р. Цана асобнага нумару—85 к.

„ВЕСТНИК СТАНДАРТИЗАЦИИ“

Штомесячная часопісь Усесаюзнага Камітэту па Стандартызацыі пры СПА.

Адк. рэдактар К. І. МАРТЭНС.

У часопісі дасцца шырокая інфармацыя аб практычных і навукова-тэхнічных работах па стандартызацыі, якія вядуцца ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

У ёй зьмяшчаюцца артыкулы кіруючага характару, як па пытаньнях арганізацыйных, мэтадалёгічных, навукова-дасьледчых і гаспадарчых, зьвязаных са стандартызацыяй, так і па пытаньнях спэцыялізацыі, якасьці прадукцыі, вучоту эфэктыўнасьці работы па стандартызацыі. У часопісі асьвятляюцца пытаньні абароны і сан. перабудовы быту, зьвязаныя са стандартызацыяй. Часопісь шырока асьвятляе стандарты, якія прапануюцца за мяжою. У часопісі зьмяшчаюцца найбольш буйныя праекты стандартаў, якія друкуюцца ў выглядзе асобных адбіткаў. Пры часопісі ў выглядзе дармовага прыложэньня будуць высылацца праекты. У часопісі будуць зьмяшчацца сьпісы запатэнтаваных Усесаюзным Камітэтам па Стандартызацыі пры СПА стандартаў па меры іх запатэнтаваньня.

Падпісная плата за 1 год (12 №№)—15 р. Падпісная плата за паўгода (6 №№)—8 р. Асобны нумар—1 р. 50 к.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ва ўсіх паштова-тэлеграфных аддзяленьнях, лістаносцамі і арганізатарамі падпіскі на прадпрыемствах.

Адрас выдавецтва: Москва, Ильинка, Рычный пер., 2, пом. 28, Издательство Техника Управления.

На аснове пастановы ЭКАНА БССР ад 28-VIII-30 г.,

ДЗЯРЖПЛЯН БССР

ПРАПАНУЕ:

усім ведамствам і арганізацыям прадставіць да 15-1-31 г. тытульныя сьпісы аб'ектаў будаўніцтва

з паказаньнем: а) чарговасьці будаўніцтва, згодна пастановы Дзяржпляну БССР ад 21-VIII—30 году; б) падрэбнасьці будматэрыялаў на аб'ектах; в) забясьпечанасьці аб'ектаў праектамі; г) год пачатку і сканчэньня будаўніцтва.

У сьпісах асобна паказаць патрэбнасьці ў будматар'ялах на няскончаныя аб'екты будаўніцтва 1930 г.

Тыя арганізацыі, якія да 16-га студзеня не прадставяць паказаных вышэй вестак, ня будуць забясьпечаны будаўнічымі матар'ялямі і ніякіх заявак ад гэтых арганізацый Дзяржплян прымаць ня будзе.

Старшыня Дзяржпляну Гольдберг.

АБВЕСТКІ

— 1 —

паведамленьні ў чарговы нумар „Зьвязды“ прымаюцца толькі да 2-х гадз. дня.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ ДАСТАЎКІ ГАЗЕТЫ „ЗЬВЯЗДА“ звяцеся па тэл.

2-49

ВЫХОДЗІЦЬ З ДРУКУ,

паступае ў продаж і рассылаецца ўсім падпісчыкам

№ 17-18 „ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК“ № 17-18

Орган ЦК КП(б)Б.

ЗЬМЕСТ:

ПЕРАДАВАЯ.—Аб чарговых задачах партыйных арганізацый на вёсцы. Піпін.—За перабудову партыйна-масавай работы на транспарце. Міх. Л.—Ад месяца—да штодзённай работы. Хадзееў.—Пытаньні падрыхтоўкі і разьмеркаваньня кадраў. Бельскі.—Некалькі заўваг аб рабоце з беднотай.

НА МЯСЦОХ:

КАРАН.—Правы апартуністы—крычыце прарыву у Гарадоцкай партарганізацыі. Салдаценко. Гербуноў.—Вопыт работы індыкатыўных груп і варгаваных комісій. Ф. Хмара.—Дрэнны вопыт.

ПАСТАНОВЫ ЦК і ЦКК КП(б)Б.

МЭТАДАРАСПРАЦОЎКІ.

Адкрыта падпіска на 1931 год на „ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК“

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

На год	На 6 мес.	На 3 мес.	На 1 мес.
2 р. 75 к.	1 р. 50 к.	75 коп.	25 коп.

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

НАРАДА РАБСЕЛЬКОРАЎ

Азарыцкі райком КП(б)Б і РКК КП(б)Б 8-1—31 г. у памяшканьні Нарпому скліканоць раённую нараду рабселькораў.

На нараду дня:

1) Вынікі асеньняй і плян веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі і задачы рабселькораў.

2) Работа РСІ і ўдзел у ёй рабселькораў.

Пачатак нарады ў 12 гадзін дня.

10-му кіраўніцтву найсісавабудаўнічых работ у г. Гомелі ПАТРЭБНЫ

ЧАРЦЁЖНІКІ, ТЭХНІКІ І ІНЖЫНЭРЫ-БУДАЎНІКІ.

Стаўкі заработы—згодна існуючых пастановаў.

Аб умовах працы дазнецца па адрасе: г. Гомель, рог Савецкай вул. і Райковага завулку.

Камісія па праверцы і чыстцы

апарату Наркамправа, Галоўсацстраху, Інстытуту Аховы Працы і «Установа» (б. ЦПП) паведаміла, што з 27-XII-30 г. установа

штодзённае дзяжурства членаў камісіі

у памяшканьні Наркамправа Бел. (вакол № 13, тел. 8-16, пл. Волі, д. № 23) з 9 да 4 і з 6 да 9 гадзін вечара.

Праводзіцца ПРАВЕРКА І ЧЫСТКА

апарату Наркамправа, Галоўсацстраху, Інстытуту Аховы Працы і «Установа» (б. ЦПП).

Просьба ад усіх нарматыў, фабрычна-заводзкіх прадпрыемстваў і устаноў, а таксама ад асоб, якія маюць адпаведныя матар'ялы, накіроўваць іх па адрасе: ЦКК-РСІ Бел. (Савецкая, 55, пакой № 16) Цэнтральнай Камісіі па чыстцы.